

Смецце — не пад нагі, а ў кантэйнер



Чым жывуць беларусы ў Расіі

СТАР. 4



Колер у жыцці, мастацтве і выкладанні

СТАР. 6



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 МАЯ 2015 г. СЕРАДА № 98 (27956) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


■ Блізкая ўлада

## ЧАРГА НА КВАТЭРУ: ПА ЗАКОНЕ І СУМЛЕННІ

### За большасцю зваротаў стаяць сямейныя гісторыі

**Першая скарга на чарговую прамую лінію нават крыху парадавала старшыню Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА, бо стала сведчаннем заклапочанасці нашых грамадзян станам і захаваннем навакольнага асяроддзя. Марыя Лапіцкая з Пінска выказала абурэнне паводзінамі некаторых суайчыннікаў, якія дазваляюць сабе варварскія спосабы нарыхтоўкі ягад, грыбоў і іншых дароў прыроды.**



Паводле меркавання Марыі Гаўрылаўны, чарніц цяпер стала значна менш, таму што збіраюць іх рознымі механічнымі прыстасаваннямі. Пінчанка прапаноўвала ўзмацніць кантроль і павялічыць штрафы, а таксама звярнуць увагу на нарыхтоўшчыкаў, якія прымаюць такія ягады (сабраныя рукамі чарніцы, як указала пенсіянерка, можна адрозніць візуальна ад тых, што вырваны з лісцем і галінамі «камбайнам»).

Старшыня аблвыканкама падзякаваў Марыі Гаўрылаўне за актыўную жыццёвую пазіцыю. Расказаў, як вядзецца барацьба з парушальнікамі прыродаахоўнага заканадаўства, звярнуў увагу на тое, што многае залежыць і ад саміх законапаслухмяных грамадзян, ад іх неабыякавасці.

Калі на гэты раз менш было званкоў ад індывідуальных забудоўшчыкаў, якія адчуваюць цяжкасці з атрыманнем крэдытаў, то два абаненты агучылі актуальную для многіх праблему — ушчыльненне забудовы. Цяпер, як вядома, многія забудоўшчыкі стараюцца не асвойваць новыя пляцоўкі, а «садзіць» шматпавярховыя дамы альбо гандлёвыя аб'екты туды, дзе ёсць гатовыя камунікацыі. А тое, што нехта праз гэта не будзе бачыць нават сонца, іх не вельмі хвалюе. Пра гэта гаварыла жыхарка дома з мікрараёна Вулька. У яе кватэры на першым паверсе сцяна аднаго даўгабуда літаральна засланіла святло. У доме нават мабільная сувязь не працуе. А ў кватэры пражывае пажылы інвалід і немаўля-ўнук. Адпаведныя службы гарвыканкама атрымалі распараджэнне выехаць на месца на наступным тыдні, каб вывучыць становішча і прыняць адпаведнае рашэнне.

Тэндэнцыяй апошняга часу можна, відаць, назваць павелічэнне колькасці зваротаў наконт працаўладкавання. Людзі просяць пакінуць іх на працы альбо прадаставіць хоць бы якую работу. І за кожным з такіх зваротаў стаіць сямейная гісторыя, часам вельмі няпростая. Напрыклад, пенсіянерка з Лунінецкага раёна прасіла за дачку, якая жыве ў Пінску. Маладая жанчына выхоўвае дваіх дзяцей, мае сярэднюю спецыяльную адукацыю, вышэйшую атрымлівае завочна. Па збегу абставін засталася без работы. А ў Пінску сёння працаўладкавацца надзвычай складана. Відавочна, што гэтага званка не было б, каб бацька сямейства, пра якое ідзе гаворка, не з'ехаў з краіны. У свой час зяць заяўніцы паехаў у Расію на заробкі, а потым застаўся там у нейкай маладзіцы. А яго былая жонка ў Пінску павінна цяпер адна карміць, апранаць, выхоўваць дзяцей...

Паводле нямецкага заканадаўства, напрыклад, такі мужчына мусіў бы даць жонцы і дзецям поўнае ўтрыманне. У нас законы іншыя, таму людзі хапаюцца за любую саломінку, нават такую, як званок старшыні аблвыканкама. І ўжо поўнага спачування заслугоўвае жыццёвая гісторыя маладой брастаўчанкі, у якую яна трапіла па волі лёсу і недасканалага заканадаўства.

У абласным цэнтры да нядаўняга часу жыла шчаслівая сям'я маладых спецыялістаў. Муж і жонка працавалі пасля заканчэння ВНУ, нарадзілася двое дзяцей. Стаялі ў чарзе на кватэру. Калі ж падышла чарга на будаўніцтва, малады муж і бацька раптоўна памёр. І тады высветлілася, што на момант пастаноўкі на ўлік жонка была зарэгістраваная ў вёсцы ў доме сваёй маці. Ён, атрымліваецца, стаяў у чарзе адзін. І ёй аб'явілі, што смерць становіцца прычынай аўтаматычнага выключэння яе мужа з чаргі, не зважаючы на тое, што і на момант пастаноўкі ў чаргу, і на момант смерці мужчына меў сям'ю. Такія вось нюансы заканадаўства. І што тут зробіш?

Праўда, кіраўнік вобласці прасіў гарвыканкам падысці да гэтай праблемы не толькі па законе, але і па сумленні. Можа, у парадку выключэння, асобнае рашэнне прыняць, але знайсці нейкае выйсце, каб падтрымаць сям'ю, якая перажыла такое гора.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# Распускайся, квітней, «Вясновы букет»!

**Адшумеў, адгрымеў, адспяваў фестываль-кірмаш беларускіх майстроў «Вясновы букет — 2015». Ён прайшоў ужо сёмы раз на заўсёдным месцы — у старажытным і адначасова маладым Лошыцкім паркавым ансамблі. Тут нядаўна завяршылася рэканструкцыя і адкрыўся пасля доўгай рэстаўрацыі сядзібны дом.**

СТАР. 4



Наталля СЫЦЬКО са Слуцка здзіўляла сваімі вышыванымі ручнікамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена КУПЧЫНА, намеснік міністра замежных спраў:**

*«Беларусь па многіх напрамках — лідар сярод усходніх суседзяў Еўрасаюза, хоць па-ранейшаму знаходзіцца пад палітычным і эканамічным ціскам з боку Захаду ўжо амаль 20 гадоў. Аднак, нягледзячы на розныя санкцыі і абмежаванні, краіна дынамічна развіваецца. На самой справе, наша краіна — відавочны лідар з пункту гледжання чалавечага развіцця і сацыяльнага прагрэсу. Адзіны відавочны негатыўны эфект санкцый — гэта зніжэнне ўзроўню даверу да ЕС як да партнёра і ўпушчаныя магчымасці супрацоўніцтва ў пытаннях пошуку адказаў на агульныя выклікі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14530,00 | ▲ |
| Еўра | 15860,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 289,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 674,25 | ▲ |

■ Адпачываем актыўна!

## ПА ЛЕГЕНДУ — НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

### Пра турыстычную прывабнасць раённых гарадоў



**Люблю падарожнічаць. І не вельмі — рабіць гэта на экскурсійным аўтобусе. Узімку, можа, і нічога сабе: цёпла, утульна, ветрам не прадзімае. Летам жа (як тыповы цеплалюб, выбіраю для паездак самыя спякотныя дні) прагрэты сонцам салон не надта радуе. Але справа нават не ў гэтым. Падарожжа ў аўтобусе па горадзе звычайна праходзіць па аднолькавай схеме: «справа вы бачыце ўнікальны архітэктурны комплекс, спыняцца не будзем, і так зразумела, а вунь там старажытны замак, але дарога вузкая, аўтобус не развернецца, таму не паедзем». У выніку аглядальная «празаконная» экскурсія не ўражвае, стамляе і надакучвае.**

Больш люблю знаёміцца з горадам пешшу або на веласіпедзе. Падчас аднаго з падарожжаў, на грэчаскі востраў Кос, вельмі ўзрадавалася, калі заўважыла веладарожку ўздоўж узбярэжжа. З веласіпеда не злезла, пакуль разоў пяць не аб'ехала аднайменную сталіцу вострава (па маштабе як беларускі райцэнтр). Аднак самае вядомае месца на Косе — храмлякарня Асклепіён, дзе некалі хворых аглядаў сам Гіпакрат, — знаходзілася ў чатырох кіламетрах ад горада. Дужа хацелася на яго паглядзець і яшчэ болей — сэканоміць на праездзе (маршрутка туды каштавала, здаецца, 4 еўра). Таму села на веласіпед і без праблем дабралася да старажытнагрэчаскай бальніцы, у свяшчэнным гаі якой ніколі ніхто не паміраў. Прадбачлівыя і вельмі дарагія дактары таго часу безнадзейна хворых у храм не пускалі.

Да чаго гэта я? Для мяне той востраў стаў добрым прыкладам таго, як трэба развіваць турызм у рэгіёнах. Экамаршруты, культурна-гістарычныя помнікі, нацыянальны каларыт, займальныя легенды — схема, прыдатная і да беларускіх мястэчкаў. Тым больш, каб падарожнічаць па невялікіх гарадах на двух колах, па сутнасці, і спецыяльныя дарожкі неабавязковыя: там веласіпедыст даўно ўспрымаецца як паўнапраўны ўдзельнік дарожнага руху. Днямі пашанцавала далучыцца да экалагічнага велапрабегу ў Вілейцы, які, у рамках Тыдня ўстойлівага развіцця, арганізавала грамадская арганізацыя «ЗАВіК» пры падтрымцы мясцовай улады, каб звярнуць увагу на турыстычны патэнцыял раёна.

СТАР. 4

**«Прамая лінія»**

### ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ У ПОБЫЦЕ

Бадай, кожны з нас марыць пра цёплы і ўтульны дом. Яшчэ лепей, калі ён не патрабуе вялікіх выдаткаў на ўтрыманне. Дасягнуць гэтага можна дзякуючы энергазберажэнню. Галоўнае — рабіць усё з розумам. Ці насамрэч энергазберагальныя лямпачкі даюць значную эканомію электрычнасці? Класы энергаэфектыўнасці бытавой тэхнікі — рэкламны ход ці рэальная выгада? Як не аплачваць залішняе ацяпленне? На гэтыя і іншыя пытанні **3 чэрвеня з 11.00 да 12.00** падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі газеты «Звязда» адкажа **намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей Аляксандравіч СЯМАШКА.**

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефоне: **8 (017) 287 18 71**. Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі (**info@zvyazda.minsk.by**) або задавайце па тэлефонах: **8 (017) 292 38 02** ці **8 (017) 287 17 51**.

### ІТ-СФЕРА ПРАЦЯГВАЕ ЛІДЗІРАВАЦЬ

У Мінску ў красавіку самая высокая сярэднямесячная заработная плата была ў арганізацыях, звязаных з вылічальнай тэхнікай (Br24 млн 873 тыс. 048) і фінансавай дзейнасцю (Br14 млн 465 тыс. 237). Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў галоўным статыстычным упраўленні Мінска. У прамысловасці сярэдняя зарплата склала Br7534,7 тыс., у будаўніцтве — Br9446,3 тыс., у сферы транспарту і ў сувязі — Br9300,3 тыс., у сельскай гаспадарцы, паляўнічтве і лясной гаспадарцы — 6704 тыс., работнікаў адукацыі — Br5892,2 тыс. (у тым ліку настаўнікаў — Br6322,7 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br8347,8 тыс.), работнікаў аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг — Br6762,5 тыс. (сярэдняя заработная плата ўрачоў — Br9435,2 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — Br6600,5 тыс.).

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Дуда стаў прэзідэнтам Польшчы



**У другім туры выбараў прэзідэнта Польшчы перамогу атрымаў Анджэй Дуда. Пра гэта сведчаць вынікі экзіт-пола.**

Паводле праведзенага апытання, Дуда, падтрыманы партыяй «Права і справядлівасьць», атрымаў 53% галасоў выбаршчыкаў; яго сапернік, дзейны прэзідэнт краіны Браніслаў Камароўскі, атрымаў 47%. Камароўскі ўжо прызнаў сваё паражэнне. «Сябры мае, не атрымалася. Так вырашылі выбаршчыкі. Дэмакратыя — гэта не толькі прызнанне вынікаў, але і павага вынікаў выбараў. Віншую Анджэя Дуду!» — прыводзяць СМІ яго словы. Апытанне сведчыць, што яўка ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў склала 56,1%. Па выніках першага тура, які адбыўся 10 мая, Дуда атрымаў 34,76% галасоў, а Камароўскі — 33,77%. Астатнія кандыдаты, у ліку якіх Януш Корвін-Міке і Магдалена Агурэк, набралі менш за пяць працэнтаў галасоў.

### У Нігерыі бензінавы крызіс



**Нігерыя, краіна з самай буйной эканомікай у Афрыцы, з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце вытворцаў нафты. Але на тэрыторыі краіны дзейнічаюць толькі чатыры нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы, таму бензіну і дызельнага паліва, якія вырабляюць на іх, недастаткова для пакрыцця патрэб эканомікі.**

У выніку ў краіне ўтварыўся маштабны энергетычны крызіс: паралізавана праца транспарту, абясточаны многія дамы і прадпрыемствы. На вуліцах гарадоў ужо значна менш аўтамабіляў, таму што многія бензакалонкі закрытыя, а перад яшчэ адкрытымі стаяць вялізныя чэргі. Многія ўнутраныя авіярэйсы адменены, а самалёты міжнародных авіяліній вымушаны прызямляцца ў суседніх краінах. Пераважная большасць прадпрыемстваў і жыхароў Нігерыі залежаць ад дызельных генератараў, бо інфраструктура электразабеспячэння знаходзіцца ў вартым жалю стане. Недахоп гаручага можа прывесці да таго, што найбуйнейшая эканоміка кантынента можа цалкам спыніцца.

ISSN 1990 - 763X

15098>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Купіце са зніжкай тавары «ад апакаліпсіса»!



**На мінулым тыдні адрасаты са спіса рассылак аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты ЗША ў выбарчай кампаніі 2012 года атрымалі лісты ад нейкага «біблеіста» Нейтана Шэпарда, які папярэджвае сваіх карэспандэнтаў аб надыходзячым апакаліпсісе.**

Як піша выданне, гаворка ідзе пра спіс рассылак Германа Кейна, былога выканаўчага дырэктара кампаніі Godfather's Pizza. Ён перадаў адрасы, атрыманыя ў ходзе сваёй кароткай выбарчай кампаніі, для патрэб уласнай кампаніі і рэкламы свайго радыёшоу. Як відаць, спіс адрасоў быў прададзены «біблеісту» Шэпарду, які выкарыстоўваў яго для прапаганды ўласных апакаліптычных ідэй, з якіх становіцца ясна, што сучасныя ЗША — тая самая «вавілонская блудніца» з кнігі Адкрыцця і што канец наступіць у студзені 2017 года. Між тым, як піша выданне, Кейн раней пазычаў гэты спіс для рэкламы падобных ідэй і тавараў. Гаворка ідзе, у прыватнасці, аб «спецыялістах па выжыванні», якія прапаноўвалі ўсім ахвотным наборы, якія дапамагаюць перажыць ядзерную вайну, і нейкага доктара, які рэкламаваў «набор для аховы мозга», нібыта здольны папярэдзіць развіццё хваробы Альцгеймера. Нейтан Шэпард таксама прапануе 60-доларавую зніжку на тавары, неабходныя для таго, каб перажыць апакаліпсіс.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Паважаю матчыну мову»



Фота Яраслава ВАНОКЕВІЧА.

**Сяргей ЛАДУЦЬКА, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук:**

— Гадоў 40 таму, калі праз канцылярыю сельгасінстытута «Звязда» трапляла на кафедру, дзе я працую і сёння, у газеце пачалі друкавацца артыкулы «Як бальзаміравалі Сталіна?» І я стаў з цікавасцю знаёміцца з сакрэтамі аб чалавеку, пра якога ў пасляваенныя гады штодня спявалася шмат даволі прыгожых песень. Тады, дарэчы, падшыўка «Звязды» знаходзілася і ў адным з пунктаў Саюздрука, дзе я дачытваў тое, што не паспяваў на кафедры. Пазней мы выпісвалі газету для нашай кафедры ў складчыну. А затым я і сам выпісваў не толькі сабе, але і для некаторых супрацоўнікаў, бо гэта было даволі танна.

Мой першы артыкул надрукавалі ў «Звяздзе» гадоў 30 таму пад назвай «А што, калі вярнуцца да ляснога «бензіну»?». Гэта пра тое, каб частку грузавых аўтамабіляў замест дэфіцытнага ў той час бензіну перавесці на газагенератарныя ўстаноўкі, што працуюць на драўніне.

Аднойчы «Звязда» надрукавала нават маю прыпеўку. Яе, памятаю, не толькі чыталі, але і дэкламавалі многія супрацоўнікі нашага інстытута. А ў апошнія гады на старонках газеты з'явіліся мае публікацыі «Бабры — жывёла карысная ці шкодная?», «Ці патрэбна турма ў цэнтры Гродна?», «Паравозы стаяць, а бабры працуюць», «Дзе той шкіпінар?»

Чаму я выпісваю «Звязду»? Бо ў газеце друкуецца шмат навін, артыкулаў на самыя розныя тэмы, своечасовай інфармацыі пра работу органаў улады, прадпрыемстваў і арганізацый. І, вядома, таму, што паважаю матчыну мову. Дарэчы, з надыходам «перабудовы» была дыскусія аб мовах. І я нават шэраг метадычных распрацовак зрабіў пабеларуску.

Мяркую, што дзеля падпіскі на газету трэба больш друкаваць чытацкіх лістоў, а калі яны не публікуюцца, то тлумачыць прычыну.

Дарэчы, у «Звяздзе» ёсць цікавая рубрыка Міхася Шавыркіна, дзе папулярызуюцца беларускія песні. Але мала хто з чытачоў, пэўна, разумее ноты. Таму, на мой погляд, газеце варта наладзіць сувязь з Першым нацыянальным каналам беларускага радыё, каб гэтыя песні агучваліся.


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

# УЗАЕМНЫ ІНТАРЭС

**Беларусь і Пакістан ствараюць дзелавы савет. Адпаведнае пагадненне было падпісана ўчора ў Ісламабадзе, паведамляе БЕЛТА.**

На думку старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіла Мятлікава, першае пасяджэнне дзелавога савета можа прайсці ўжо восенню гэтага года, хутчэй за ўсё, у Беларусі. Прэзідэнт Федэрацыі гандлёва-прамысловых палат Пакістана і старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты сёння таксама падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.

Гэта вынік работы толькі ў адным накірунку. Паводле слоў прэс-сакратара Прэзідэнта Беларусі Наталлі Эйсмант, ужо некалькі дзён у Пакістане працуе вялікая беларуская дэлегацыя. Міністры, кіраўнікі найбуйнейшых прадпрыемстваў і холдынгаў, дзяржаўных і прыватных фірмаў прадуктыўна кантактуюць са сваімі калегамі.

Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Пакістан стане заключным этапам праведзенай вялікай работы. Як сказала Наталля Эйсмант, фармат візіту застаецца нязменным. Плануецца, што ён адбудзецца 28—29 мая. Праграмай візіту запланаваны перамовы з Прэзідэнтам Пакістана Мамнунам Хусэйнам, прэм'ер-міністрам гэтай краіны Навазам Шарыфам, спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Сардарам Садзікам. Па выніках візіту чакаецца падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў.

■ Тры пытанні да ўлады

# «Тарас» вярнуўся, а хутка — «Гарадоцкі Парнас»

**Добрай навіной для жыхароў Гарадоцкага раёна і ўсёй Беларусі стала вестка пра вяртанне на месца скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай паэме «Тарас на Парнасе». Нагадаю, яна з'явілася ў райцэнтры летась падчас «Дажынак». А праз некалькі месяцаў яе дэмантавалі. Вярнуўся «Тарас» дзякуючы расійскаму канцэрну, якому на тэрыторыі раёна належыць сельскагаспадарчае прадпрыемства. Канцэрн выплаціў грошы, каб ён навечна застаўся на пастаменце. А якія аб'екты сацыяльнага прызначэння з'явяцца ў Гарадоцкім раёне? Пра гэта тры пытанні да Надзеі БУРУНОВАЙ, намесніка старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях.**



Помнік літаратурнаму герою.

***— Гарадоцкі раён, дзякуючы таму, што райцэнтр стаў сталіцай абласных «Дажынак», вельмі папрыгажэў і стаў яшчэ больш прывабным для турыстаў. Надзея Аляксандраўна, калі ласка, нагадайце, што было зроблена напярэдадні правядзення ў Гарадку свята працаўнікоў вёскі?***

— Будаўнікі шмат чаго зрабілі не толькі ў райцэнтры, але і ў вясковых населеных пунктах. Былі адрамантаваны дахі і фасады будынкаў, правялі ўнутраныя работы на 5 аб'ектах аховы здароўя, 7 — адукацыі. Зроблены капітальны рамонт гарадскога Палаца культуры, дзіцячай школы мастацтваў і раённага краязнаўчага музея. Рэканструявалі будынак былога кінатэатра «Радзіма» пад шматфункцыянальны цэнтр: з выставачнай залай, бібліятэкай, кавярняй... Адкрылася гасцініца Віцебскага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па зімовых відах спорту, была пракладзена траса для заняткаў лыжнікаў на працягу ўсяго года ва ўнікальным прыродным куточку «Віраб'ёвы горы». Летась трасу агледзелі замежныя эксперты і далі вельмі высокую ацэнку таму, што зроблена. Але работы на гэтым аб'екце яшчэ не скончыліся. У райцэнтры будуецца басейн...

***— У вёсцы Бычыха ідзе будоўля цэнтра для пражывання інвалідаў і пажылых грамадзян «Дом міласэрнасці». Раскажыце, што гэта будзе за ўстанова?***

— Аналагічныя дамы дзейнічаюць у Еўропе даўно, і наш будзе насамрэч еўрапейскім: па ўмовах пражывання і ўтульнасці. У цэнтры будуць аказваць сацыяльную, медыцынскую і духоўную дапамогу не толькі старым людзям, але пры магчымасці і тым, хто трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю.

***— Брэндам раёна стала свята «Гарадоцкі Парнас». Чым ён можа зацікавіць турыстаў?***

— З 1998 года ў Гарадку традыцыйна ў першыя дні чэрвеня праводзіцца свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас», прысвечанае знакамітаму паэту-земляку Канстанціну Вераніцыну, аўтару паэмы «Тарас на Парнасе».

У праграме свята яркія канцэрты з удзелам творчых калектываў раёна і гасцей з вобласці, майстар-класы народных умельцаў, выставы вырабаў народнай творчасці («Тарасаўскія панадворкі»), нацыянальнай кухні («Тарасаўскія прысмакі»). Традыцыйна ў рамках свята праводзіцца аўтобусная экскурсія па вераніцынскіх месцах. Цікавым і пазнавальным з'яўляецца правядзенне свята паэзіі і песні «Вераніцынская зорка». У ім прымаюць удзел вядомыя пісьменнікі і паэты, члены саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі, мясцовыя паэты, аматары паэтычнага слова, народныя фальклорныя калектывы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **Червенское райпо, г. Червень, ул. Ленинская, 32.** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Здание швейного цеха и магазин | Здание многофункциональное | 152,8 кв.м | 615/С-33713 | Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Ленинская, д. 49 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности:** | 1А1/д – склад швейного цеха, 2А1/д – склад магазина, 3А1/к – топочная, тамбур, терраса, сарай. |
| **Сведения о земельном участке:** | Площадь (га): 0.0481, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования с установленными ограничениями: охранная зона ЛЭП напряжением до 100 вольт (0,0099 га). Целевое назначение: земельный участок для обслуживания здания швейного цеха и магазина. |

**Начальная цена с НДС 20% – 277 300 000 белорусских рублей.**

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **10** рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после проведения аукциона.

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.02.2015*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.06.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **26.06.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

**ОАО «Світанак» г. Жодино**

**ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ**
**по выполнению пусконаладочных работ на объекте:**
«Техническое переоснащение красильно-отделочного цеха с внедрением машины для печати цилиндрическими сетчатыми шаблонами, оборудованной системой прямого газового обогрева в г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 с реконструкцией ГРУ и узла учета».

**Заявки принимаются по адресу:**
**г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 11.00 08.06.2015 г.**
**За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.**
УНН 600038919


■ Парламенцкі дзённік

# ЯШЧЭ АДЗІН ПЕРСПЕКТЫЎНЫ ПАРТНЁР

## Спікеры абедзвюх палат сустрэліся з дэлегацыяй Інданезіі

**«Беларусь разглядае супрацоўніцтва з Інданезіяй як адзін з прыярытэтных напрамкаў нашай знешняй палітыкі», — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас наведвання спікерам Савета рэгіянальных прадстаўнікоў Народнай кансультатыўнай асамблеі Рэспублікі Інданезія Ірманам Гусманам верхняй палаты беларускага парламента.**

«Мы адкрытыя для абмеркавання ўсіх пытанняў супрацоўніцтва, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Нараўне з палітычнымі і парламенцкімі кантактамі надаём увагу пытанням гандлёва-эканамічным, інвестыцыйным, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва», — запэўніў сенатар.

Ён падкрэсліў, што пасля першага ў гісторыі візіту ў Інданезію беларускай дзяржаўнай дэлегацыі на чале з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам два гады таму ўзаемны тавараабарот вырас амаль удвая. «Павялічыўся і аб'ём гандлю ў першым квартале бягучага года ў 1,8 раза», — паведаміў спікер верхняй палаты.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама звярнуў увагу на ўдзел Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе і дадаў, што праз нашу краіну Інданезія мае магчымасць выйсці на рынак ЕАЭС.

Сёння аснову беларускага экспарту складаюць калійныя ўгнаенні і шыны. З 2012 года да гэтых пунктаў дадаліся пастаўкі грузавых аўтамабіляў, з 2013-га — прадукцыі двайнога прызначэння і сельскагаспадарчых трактароў, з 2014-га — капралактаму і поліямідаў.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падчас сустрэчы з Ірманам Гусманам зрабіў акцэнт на тым, што Інданезія з'яўляецца для нас важным гандлёвым партнёрам у рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі.

— Мы разглядаем ваш візіт як важны крок па актывізацыі супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Інданезіяй ва ўсіх сферах. Як адзначалася на сустрэчы ў Прэзідэнта і прэм'ер-міністра, нягледзячы на крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, у нас даволі актыўна нарошчваецца ўзаемны тавараабарот. І мы лічым, што ў гэтым плане нашы краіны маюць вялікі патэнцыял, — сказаў спікер ніжняй палаты парламента.

Ён таксама адзначыў значэнне візіту Прэзідэнта нашай краіны ў Інданезію ў 2013 годзе і згадаў візіт спікера Савета народных прадстаўнікоў Інданезіі Марзукі Алі ў Беларусь у тым жа годзе.

— На жаль, візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі пакуль не адбыўся па аб'ектыўных прычынах, але ён з парадку дня не зняты, і ў самы блізкі час мы пастараемся яго ажыццявіць, — запэўніў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

На думку Уладзіміра Андрэйчанкі, міжпарламенцкія адносіны — важнае звяно ў сістэме міждзяржаўных зносін. У беларускім парламенце з гэтай мэтай ужо створана рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Інданезіі, якую ўзначальвае Уладзімір Васіленка, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях. Старшыня ніжняй палаты выказаў зацікаўленасць у тым, каб у парламенце Інданезіі з'явілася група дружбы з Беларуссю. Як патлумачыў Уладзімір Андрэйчанка, гэта дазволіла б больш цесна кантактаваць, абменьвацца вопытам парламенцкай працы.

— Хацеў бы адзначыць канструктыўнае ўзаемадзеянне нашых дэлегацый у рамках міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН. Думаю, гэтыя ўзаемаадносіны трэба пашырыць не толькі ў міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН, але і ў Міжпарламенцкім саюзе, іншых міжнародных арганізацыях.

У сваю чаргу Ірман Гусман выказаў надзею на развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва з Беларуссю і звярнуў увагу на актывізацыю палітычных сувязяў.

На 22-23 чэрвеня 2015 года запланавана пятае пасяджэнне міжурадавай беларуска-інданезійскай камісіі па гандлёвым, эканамічным, навуковым і тэхнічным супрацоўніцтве.

* * *

Інданезія адносіцца да катэгорыі аграрна-індустрыяльных краін. Для яе эканомікі характэрна актыўная роля дзяржавы: яна валодае прыкладна 140 буйнымі прадпрыемствамі ў розных сектарах нацыянальнай гаспадаркі, а таксама кантралюе цэны на шэраг тавараў, уключаючы базавыя прадукты харчавання і гаруча-змазачныя матэрыялы. У аб'ёме ВУП доля прамысловай вытворчасці складае прыкладна 47%, сферы паслуг — 37%, сельскай гаспадаркі — 15%. Пры гэтым у прамысловасці занята 12,8% працаздольнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 38,3% і ў сферы паслуг — 48,9%.

Органам заканадаўчай улады ў Інданезіі з'яўляецца двухпалатны парламент — Народная кансультатыўная асамблея. Яна складаецца з ніжняй палаты, Савета народных прадстаўнікоў, і верхняй — Савета рэгіянальных прадстаўнікоў.

**Вераніка ПУСТАВІТ, Надзея ЮШКЕВІЧ.**

### Заява падпісана

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савет рэгіянальных прадстаўнікоў Інданезіі падпісалі сумесную заяву аб супрацоўніцтве.**

**Гэта адбылося па выніках афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Інданезіі на чале са спікерам Савета рэгіянальных прадстаўнікоў Народнай кансультатыўнай асамблеі гэтай краіны Ірманам Гусманам. З беларускага боку заяву падпісаў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.**

**Пасля заканчэння цырымоніі ён удакладніў, што дакумент увабраў у сябе ўсе дамоўленасці, дасягнутыя ў ходзе перамоў, якія прайшлі на вышэйшым і высокім узроўнях. «Адзін з аспектаў — тое, што мы будзем больш увагі надаваць рэгіянальнаму супрацоўніцтву, і тут у нас дастаткова актыўна працуюць тры рэгіёны — Брэсцкая і Магілёўская вобласці, а таксама горад Мінск», — заўважыў старшыня Савета Рэспублікі.**

■ Курсавая розніца

# РУБЕЛЬ БУДЗЕ РОЎНЫМ

## Прынамсі, у найбліжэйшыя два-тры месяцы

**Пра гэта паведаміў эксперт кампаніі ТАА «Бізнес-Форэкс» Міхаіл Грачоў, адказваючы на пытанні карэспандэнта «Звязды».**

***— Як у найбліжэйшы час будуць паводзіць сябе долар і еўра?***

— Пасля выступу 19 мая члена выканаўчага савета ЕЦБ Бенуа Кёры кошт еўра ў дачыненні да долара ЗША знізіўся. Таксама зніжэнню еўравалюты спрыялі звесткі па інфляцыі з ЗША. Індэкс спажывецкіх цэн падняўся да 1,8% у гадавым вылічэнні супраць чаканых 1,7%. У цэлым паказчыкі эканомікі як у ЗША, так і ў Еўрасаюзе пакуль не дасягнулі мэтавых узроўняў (беспрацоўе, інфляцыя і рост ВУП). На гэтым фіксуе ўвагу Камітэт па адкрытых рынках Федэральнай рэзервовай службы ЗША, як вынікае з пратаколаў яго пасяджэння ў канцы красавіка. І гэты фактар ляжыць у аснове прыняцця рашэння па працэнтнай стаўцы ФРС, якое можа быць прынята ў канцы гэтага года. Такім чынам, крэдытна-грашовая палітыка краін ЕС і ЗША мяняцца не будзе і, хутчэй за ўсё, найбліжэйшыя два-тры тыдні суадносіны еўра да долара застануцца на цяперашнім узроўні 1,0850-1,1150. Вельмі паказальнымі могуць стаць звесткі па рынку працоўнай сілы 5 чэрвеня.

***— Наколькі даўгавечным будзе ўмацаванне расійскага рубля?***

— Цяперашні стан эканомікі РФ і валютнага рынку ў прыватнасці паказвае, што курс расійскай валюты знаходзіцца на ўзроўні, прымальным для асноўных сегментаў расійскай эканомікі. Адсюль далейшае ўмацаванне рубля малаверагоднае. Галоўны вынік, якога дасягнуў Цэнтрабанк РФ, — гэта стабільнасць на ўнутраным валютным рынку. А гэта, у сваю чаргу, адна з ключавых умоў стабільнасці эканомікі ў цэлым. Нягледзячы на слабую статыстыку першага квартала, стабілізацыя фінансавай сістэмы дае падставу чакаць запавольвання рэцэсіі і выхаду на станоўчы рост эканомікі ў 2016 годзе. Чаканы калідор вагання цаны долара ляжыць у межах 48-52 рублёў.

***— Для чаго Цэнтрабанк Расіі скупляе валюту на біржы?***

— Асноўная мэта — папаўненне золатавалютных рэзерваў. Сёлета ў красавіку ў выніку росту цэн на нафту вышэй за 65 долараў за барэль (у апошні варыянт бюджэту закладзена цана 60 долараў за барэль) утварыліся лішкі. У адпаведнасці з бюджэтным правілам, гэтыя сродкі накіроўваюцца на фарміраванне ЗВР. Акрамя рэзерваў у доларах ЗША, расійскі Цэнтрабанк павялічыў пазіцыю ў амерыканскіх дзяржаблігацыях і металічным золаце. Такім чынам, Цэнтрабанк аднаўляе страты рэзерваў у 2014 годзе, якія склалі каля 120 млрд долараў. Другой мэтай куплі валюты можна назваць падтрыманне курсу рубля на бягучым узроўні, бо далейшае ўмацаванне можа негатыўна адбіцца на экспарцёрах.

***— Беларускі рубель будзе ўмацоўвацца або слабець?***

— Курс беларускага рубля ў першым квартале 2015 года стабілізаваўся на ўзроўні 14300-14800 рублёў за долар ЗША. Палітыка Нацбанка, як вынікае з публічных выступленняў, накіравана на стабілізацыю валютнай сістэмы і зніжэнне ўзроўню інфляцыі. З першай задачай, як паказвае бягучая сітуацыя, Нацбанк справіўся. Адменены камісійныя зборы, зніжаны ўзровень абавязковага продажу валюты, з чэрвеня ўводзіцца інструмент падвойнага валютнага аўкцыёна. Наступным крокам чакаецца паніжэнне стаўкі рэфінансавання з цяперашніх 25% гадавых, што павінна ажывіць рынак крэдытавання. Акрамя гэтага, урадам падпісаны шэраг міжнародных дагавораў, у прыватнасці з Кітайскай Народнай Рэспублікай, якія адкрываюць дарогу замежным крэдытам у Беларусь. Такім чынам, структурных прычын для паслаблення беларускага рубля пакуль няма. Умацаванне таксама малаверагоднае, у большай ступені таму, што ў першым квартале ўпаў попыт на прадукцыю беларускага рэальнага сектара ў асноўнага імпарцёра — Расійскай Федэрацыі. Паводле звестак Белстата, падзенне ВУП за студзень—красавік гэтага года складае 2,6% у гадавым вылічэнні. Верагодней за ўсё, курс беларускага рубля застанецца на цяперашнім узроўні ў найбліжэйшыя два-тры месяцы.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

# АД СКАРЫНЫ ДА ДУХОЎНАЙ СВЯДОМАСЦІ

**Ёсць такая грамадская арганізацыя — Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (МАБ). Створана яна на пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя па ініцыятыве прафесара Адама Мальдзіса (ён жа і ўзначальваў яе шмат гадоў), яна нямала зрабіла і робіць па аб'яднанні даследчых намаганняў вучоных-беларусістаў розных краін і народаў: самой Рэспублікі Беларусь, а таксама Расіі, ЗША, Украіны, Польшчы, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Францыі, Чэхіі, Славакіі, Японіі...**

Ва ўсіх гэтых і многіх іншых краінах свету даволі рэгулярна публікуюцца ў навуковых часопісах артыкулы па гісторыі, культуры, мове, літаратуры Беларусі, у некаторых універсітэтах чытаюцца лекцыйныя курсы па гэтых прадметах, часам ствараюцца беларусазнаўчыя кафедры, што даюць магчымасць студэнтам атрымліваць адпаведныя веды і нават спецыяльнасці, і г. д. Раз на 4–5 гадоў праводзяцца міжнародныя кангрэсы беларусістаў, на якія з Еўропы, Азіі, Амерыкі з'язджаюцца навукоўцы, каб падзяліцца сваімі пошукамі і знаходкамі ў розных гуманітарных галінах беларусазнаўства, калектыўна абмеркаваць і ацаніць зробленае, вызначыць кірункі далейшай дзейнасці, правесці справаздачна-перавыбарны сход МАБ...

Вось і заўтра, 28 мая, у памяшканні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі распачынаецца праца VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў, які ўступным словам адкрые цяперашні старшыня МАБ — вядомы гісторык, акадэмік НАН Беларусі Міхаіл Касцюк. На двух пленарных пасяджэннях кангрэса і ў 18 яго тэматычных блоках (секцыях) будзе заслухана і абмеркавана звыш ста дакладаў. Назаву толькі асобныя з гэтых блокаў: «Старабеларускае моўнае пасрэдніцтва ў кантактах Усходу і Захаду», «Беларуская літаратурная гісторыя сёння: праблемы і перспектывы», «Беларуска-іншанацыянальнае культурнае ўзаемадзеянне», «Духоўны вопыт Беларусі і іншых славянскіх краін у кантэксце гісторыі пісьменства: сацыякультурнае вымярэнне», «Рэлігійны складнік тоеснасці беларусаў», «Нацыянальная самасвядомасць і мастацкая літаратура», «Хрысціянства ў гісторыі Беларусі», «Замежнае беларусазнаўства ў кантэксце еўрапейскай славістычнай традыцыі другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя», «Беларуская мова як замежная» і інш. Сваімі новымі навуковымі напрацоўкамі, адкрыццямі падзеляцца такія вядомыя беларусісты, як Юрый Лабынцаў і Наталля Запольская (Расія), Рыгор Піўтарак і Аляксандр Скапненка (Украіна), Джым Дынглі і Арнольд Макмілін (Вялікабрытанія), Рышард Радзік і Сяргей Кавалёў (Польшча), Герд Генчэль (Германія), Андраш Золтан (Венгрыя), Андрэй Зінкевіч (Аўстрыя), Сіёры Кіёсава (Японія) і іншыя замежныя вучоныя. Зразумела, большасць дакладаў прачытаюць прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага аддзялення МАБ — літаратуразнаўцы, лінгвісты, культуролагі, гісторыкі. Сярод іх — Аляксандр Булыка, Георгій Галенчанка, Сяргей Запрудскі, Тацццяна Кабржыцкая, Валянціна Мароз, Павел Навойчык, Жанна Некрашэвіч-Кароткая, Мікалай Прыгодзіч, Віктар Скарабагатаў, Мікалай Хмяльніцкі і інш.

Сёлетні Міжнародны кангрэс беларусістаў праходзіць напярэдадні знамянальнай даты — 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якую мы будзем адзначаць у 2017 годзе. Таму лагічна, што пад кіраўніцтвам намесніка старшыні МАБ Алеся Сушы запланаваны два пасяджэнні «круглага стала» «Францыск Скарына і яго час» з цэлым шэрагам цікавых выступленняў беларускіх, англійскіх і польскіх даследчыкаў, а таксама прэзентацыя новых выданняў па Скарыніяне. Сярод апошніх — шэраг тамоў з поўнага факсімільнага выдання кніжнай спадчыны Францыска Скарыны ў 21 томе, над якім працуе Нацыянальная бібліятэка Беларусі, зборнік матэрыялаў IV Скарынаўскіх чытанняў «Віленскія выданні Францыска Скарыны ў кантэксце эпохі Адраджэння», унікальная кніжка «Францыск Скарына на мовах народаў свету», выпушчаная Выдавецкім домам «Звязда». Запланавана прэзентацыя і некаторых іншых беларусазнаўчых выданняў: «Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага XV—XVII стст.», «Даследаванні па міжславянскіх моўных і культурных кантактах» Андраша Золтана, «Паэзія Антона Гарэцкага» Ганны Шаўчэнкі і інш. Думаецца, гэтыя прэзентацыі таксама выклічуць цікавасць членаў кангрэса.

Апошнім часам мы часта гаворым пра патрэбу павышаць імідж Беларусі ў шырокім свеце. На гэты імідж спакойна, мэтанакіравана, плённа працуюць і члены Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Пажадаем жа добрага спору ў іх такой патрэбнай працы, як, зрэшты, і самому кангрэсу.

**Вячаслаў РАГОЙША, прафесар БДУ, член аргкамітэта Міжнароднага кангрэса беларусістаў.**

## Выслухаюць і дапамогуць

**Адказныя асобы аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама 30 мая з 9.00 да 12.00 зноў выйдуць на тэлефонную сувязь з насельніцтвам. Такія стасункі адбываюцца ўжо на працягу некалькіх месяцаў. І, як паказвае практыка, дазваляюць аператыўна вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць у самых розных сферах.**

**Брэсцкі аблвыканкам** — намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ДЗЯМ'ЯНАЎ Эдуард Міхайлавіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам** — намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам** — намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

У Беларусі сёлета арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей. Такія прамыя тэлефонныя лініі стартавалі 17 студзеня і праводзяцца па суботах.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

# БЛІЖЭЙ ДА ВЫТВОРЦАЎ

**Кіраўніцтва Міністэрства гандлю параіла аптовым арганізацыям накіраваць свае намаганні на больш цеснае супрацоўніцтва з вытворцамі і пастаўшчыкамі.**

Паводле інфармацыі Мінгандлю, на гадавым сходзе членаў Асацыяцыі арганізацый аптовага гандлю **першы намеснік міністра Артур КАРПОВІЧ** прапанаваў аптовым гандлярам больш актыўна ўдзельнічаць у дзейнасці асацыяцыі. Гэта, на яго думку, дапаможа каардынаваць вырашэнне пытанняў, якія ўзнікаюць паміж аптавікамі, рознічнымі арганізацыямі, вытворцамі і пастаўшчыкамі. Таксама на сходзе падвялі вынікі працы аб'яднання з часу яго стварэння ў 2013 годзе і прызначылі новага старшыню праўлення. Ім стала дырэктар прадпрыемства гомельскага ААТ «Аблаптгандаль» Інара Захаранка. У сферы аптовага гандлю яе стаж складае больш за дваццаць гадоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# «ЗАЛАТЫЯ» АРНІТОЛАГІ

**Арнітолагі-аматары з каманды «Бульбашы» заваявалі «золата» на бёрдынг-ралі ў Расіі.**



Каманда «Бульбашы»

Сярод іх быў і жыхар Шаркаўшчынскага раёна Валерый Кавалёнак, прафесійны фатограф.

— Беларусы заўсёды пасляхова выступаюць на «птушыных чэмпіянатах». А гэтыя спаборніцтвы па фатаграфаванню птушак адбыліся на тэрыторыі нацыянальнага парку «Смаленскае Паазер'е». Мы перамаглі, бо за 24 гадзіны сфатаграфавалі прадстаўнікоў 93 відаў. Для параўнання, расійская каманда, якая атрымала «серабро», — «толькі» 73. Усяго ў ралі бралі ўдзел больш за 10 камандаў з розных краін, — распавёў фатограф.



Птушка, падобная да канарэйкі

Арганізатары ўдзячны нашым непрафесійным арнітолагам за тое, што яны сфатаграфавалі птушку, аб існаванні якой на Смаленшчыне не ведалі. Крылатая істота, падобная да канарэйкі, мае назву еўрапейскі юрок, падобная на канарэйку. І яна, аказваецца, цяпер жыве не толькі ў параўнальна цёплых рэгіёнах. Дарэчы, цікавы факт. Спявае яна, седзячы на ўзвышшы, напрыклад, на тэлевізійнай антэне, і падчас такавальнага палёту, які нагадвае палёт кажана. Песня складаецца з серыі звонкіх трэляў...

Фота, зробленыя ўсімі «алімпійцамі», будуць выкарыстаны ў навуковай і асветніцкай дзейнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота з асабістага архіва Валерыя КАВАЛЁНКА.**

# РАЗВЕДКА ЎДАЛАСЯ...

**Адзін залаты і 16 сярэбраных медалёў прывезла беларуская каманда з адкрытага чэмпіянату прафесійнага майстэрства WorldSkills краін СНД, які праходзіў у Казані. Удзел у ім узялі прадстаўнікі Расіі, Беларусі, Казахстана, Арменіі і Кіргізіі. Да спаборніцтваў далучыліся таксама каманды з Грузіі, Украіны, Латвіі і Літвы.**

Навучэнка Мінскага дзяржаўнага ПТК швейнай вытворчасці Вольга Закрэўская заваявала «золата» ў кампетэнцыі «Дызайн адзення». Па ўсіх іншых кампетэнцыях, дзе былі прадстаўлены беларусы (цырульніцкае мастацтва, кухарская справа, абліцоўванне пліткай, сталярная справа і г.д), нашы хлопцы і дзяўчаты атрымалі сярэбраныя ўзнагароды. Да апошняга моманту інфармацыя аб тых, хто прэтэндуе на перамогу, заставалася закрытай (нават для экспертаў адной кампетэнцыі). Свае балы журы адпраўляла ў спецыяльны цэнтр электроннай апрацоўкі паведамленняў.

Расіяне занялі першыя месцы ў 17 відах спаборніцтваў. Такім чынам, у агульным заліку WorldSkills СНД першае месца — за камандай Расіі, другое — у беларусаў і трэцяе — у Казахстана.

Паездка ў Казань стала своеасаблівай «разведкай боем» — генеральнай рэпетыцыяй перад сусветным чэмпіянатам прафесійнага майстэрства, які пройдзе ў жніўні ў Бразіліі з удзелам прадстаўнікоў 70 краін. Для ўсіх гэта выдатная магчымасць зразумець, якія спецыялісты будуць запатрабаваны працадаўцамі ў найбліжэйшы час і, магчыма, змяніць цяперашнюю сістэму падрыхтоўкі рабочых кадраў у краіне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПАДПОЛЬНЫЯ «МЕТАЛІСТЫ»

**У Оршы прадпрымальныя грамадзяне ў гаражы арганізавалі пункт прыёму лому. Чорны і каляровыя металы ў сваю чаргу здавалі ў арганізацыі, якія афіцыйна купляюць металалом.**

— За няпоўныя тры гады атрымалі даход ад гэтай незаконнай дзейнасці на суму звыш 360 мільёнаў рублёў. Па выніках праверак у дачыненні да «чорных» нарыхтоўшчыкаў заведзена крымінальная справа. Цяпер іх лёс вызначыць суд, — паведамілі «Звяздзе» ва Упраўленні дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 мая 2015 г.
№ 10 (350)


ЁСЦЬ КАНТАКТ

## ЭФЕКТЫЎНАЯ ДАПАМОГА



**Як дэпутат парламента можа быць карысны людзям? Чаму без яго выездаў на месцы немагчыма абысціся? Што часцей за ўсё абмяркоўваюць з ім грамадзяне? Пра гэта «МС» расказаў дэпутат ад Ваўкавыскай выбарчай акругі, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы Аляксандр СЯГОДНІК.**

***— Якім чынам вы працуеце з мясцовымі Саветамі дэпутатаў?***

— Тут можна вызначыць некалькі кірункаў. Першы — удзел у пасяджэннях сесій. Другі — сустрэчы з дэпутатамі. Трэці — прыём грамадзян. Апошняе я часцей за ўсё практыкую ў сельскіх Саветах. Таксама выязджаю на месцы, калі трэба разабрацца з пэўнай мясцовай праблемай і ёсць неабходнасць падключаць дэпутацкі корпус.

Не так даўно я выязджаў у Субацкі сельсавет Ваўкавыскага раёна. Там былі праблемы з рамонтам дарогі. Безумоўна, перш за ўсё гэтае пытанне вывучылі старшыня Савета і старасты вёсак. Пасля з іх дапамогай мы звярнуліся да службаў, якія павінны выконваць рамонтныя работы. Праца пайшла. Дэпутаты (і я ў прыватнасці) адсочваюць, каб яна не спынялася. Дарэчы, было вельмі прыемна, калі праз пэўны час падыходзілі старасты вёсак і дзякавалі за вырашэнне праблемы, бо дарогу пачалі рамантаваць. Вельмі важна, каб была зваротная сувязь.

***— З якімі пытаннямі да вас звяртаюцца?***

— Зараз яны часцей за ўсё датычацца прыватызацыі ўчасткаў у сельскай мясцовасці. Людзі скардзяцца на затрымку з афармленнем дакументацыі, яе аплатай і коштам. Але апошняе рэгламентуюць нарматыўныя дакументы, з якімі не паспрачаешся. Праўда, кіраўнікі гаспадарак на месцах могуць прыняць рашэнне і паменшыць плату.

Асноўнымі пытаннямі застаюцца праблемы з рамонтам дарог і тыя, што датычацца жылля.

На сустрэчы з грамадзянамі я запрашаю дэпутатаў мясцовых Саветаў. Яны ж з'яўляюцца непасрэднымі кіраўнікамі і нясуць адказнасць за вырашэнне праблем.

***— А калі б вы не выехалі на месца, ці атрымалі б той жа вынік?***

— Трэба разумець, што любое пытанне вырашаецца, калі ёсць адпаведная нарматыўная база і фінансавыя сродкі. Нельга сказаць, што мясцовыя ўлады бяздзейнічаюць. Яны стараюцца па меры сваіх магчымасцей. Што можа дэпутат? Паскорыць вырашэнне пытання, абазначыць яго на высокім узроўні, прыцягнуць увагу шырокага кола адказных асоб.

Некаторыя пытанні вырашаюцца хутчэй, таму што ў дэпутата Палаты прадстаўнікоў ёсць на гэта большыя паўнамоцтвы. А як інакш паўплываеш? Мы не можам прафінансіраваць штосьці з уласных сродкаў.

Бываюць выпадкі, калі праблема заключаецца ў нарматыўнай базе. Калі становіцца зразумела, што на яе трэба і можна паўплываць, мы робім гэта. Напрыклад, да мяне звярталіся пенсіянеры, калі ўводзіўся збор пошлін за карыстанне аўтатранспартам. Спачатку і яны былі абавязаны выплачваць тую ж суму, што і любы іншы грамадзянін. Але гэта для пенсіянераў непад'ёмна. Былі прапановы, каб тых, каму больш за 70 гадоў, увогуле вызваліць ад падатку. Калі мы прымалі закон аб бюджэце і падатковы кодэкс, я хадайнічаў, каб паменшылі пошліну для пенсіянераў. У выніку было прынята рашэнне, што пенсіянеры будуць плаціць 50% ад яе. Гэта прыклад таго, як дэпутат, які працуе на месцы, можа вырашыць набалелую, надзённую праблему грамадзян.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

УСЁ Ў ПАРАДКУ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ПАРУШАЛЬНІКАЎ — НА СТЭНД!

***Мінскі раён цяжка выходзіць з «зімоўкі». За восень-зіму тут назапашваецца шмат смецця. Гэта і зразумела: у раёне пражывае больш як 200 тысяч чалавек.***

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

**У выхадныя дні, асабліва ў летні перыяд, колькасць насельніцтва павялічваецца мінімум у 3-3,5 раза: дачнікі, садаводы, агароднікі, адпачываючыя на вадасховішчах і азёрах. І, зразумела, не ўсе сярод іх выхаваныя і законапаслухмяныя. Хтосьці не лічыць заганай пакінуць смецце пасля пікніка, а то і наогул выкінуць яго на абочыну дарогі.**

Да «масавай міграцыі» ўсіх ахвотных на прыроду засталося няшмат часу. Што зроблена і што належыць зрабіць напярэдадні сезона адпачынку, вывучалі падчас рэйду прадстаўнікі жыллёва-камунальнай службы, дзяржаўнай дарожнай інспекцыі, лясной і экалагічнай службаў, мясцовых органаў улады і самакіравання.

Першы прыпынак — бераг Заслаўскага вадасховішча, а дакладней пляж пад нумарам 5. Месца адпачынку практычна гатова да прыёму наведвальнікаў, засталіся дробязі накшталт падсыпкі свежым пяском. Пляж абсталяваны кабінкамі для пераапранання, лаўкамі, біяпрыбіральнямі, кантэйнерамі для смецця, дзіцячымі пляцоўкамі, мангаламі для прыгатавання шашлыку. Тут створаны і дадатковыя месцы для паркоўкі машын, так званыя «кішэні» паміж дрэвамі, падсыпаныя шчэбнем.

— Гэтыя месцы мы ўзаконілі, — адзначыў намеснік начальніка ДАІ Мінскага раёна Іван КУЗЬМЕНКА. — Колькасць асабістага транспарту ў «пік» купальнага сезона на вадасховішчы ў разы перавышае колькасць добраўпарадкаваных месцаў для стаянкі. Кіроўцы пакідаюць сваіх «жалезных коней» на абочынах дарог агульнага карыстання, што стварае нязручнасці і нават небяспечныя сітуацыі і для пешаходаў, і для вадзіцеляў. Таму мы імкнёмся па максімуме выкарыстоўваць тэрыторыю, што прылягае да зон адпачынку. Побач з пляжам №5, напрыклад, абсталяваны 4 стаянкі, разлічаныя на 50 машын.

> **По выніках абследавання домаўладанняў выдадзена больш як 10 тысяч прадпісанняў, састаўлена звыш 300 пратаколаў.**



Пляж пад нумарам 5.

Пытанням добраўпарадкавання значную ўвагу надаюць дэпутаты Мінскага раёна, у тым ліку актыўна працуюць з насельніцтвам 267 дэпутатаў сельскіх Саветаў.

— Мы імкнёмся дайсці да кожнага ўласніка дома, нагадаць усім, каб падтрымлівалі парадак не толькі на сваіх падворках, але і ў месцах агульнага карыстання, — кажа старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей Шаблыка. — У нас распрацаваны спецыяльныя памяткі, якія паштальёны дастаўляюць жыхарам Мінскага раёна. Па выніках абследавання домаўладанняў выдалі больш як 10 тысяч прадпісанняў, саставілі звыш 300 пратаколаў. Гэтыя меры, як паказвае практыка, дзейсныя. Толькі за месяц ліквідавана 136 стыхійных звалак.

Праз Мінскі раён праходзіць шмат транзітнага транспарту. Нярэдкія выпадкі, калі вадзіцелі і пасажыры «па ходзе» выкідваюць пакеты са смеццем і пластыкавыя бутэлькі — ім так зручна. Ды і самі жыхары часам вывозяць розныя непатрэбныя рэчы ў лес, на прыпынкі грамадскага транспарту. Кожнага за руку не зловіш, кантралёра не прыставіш.

Дарэчы, цяпер у Мінскім раёне ўстаноўлены 15 камер фотавідэафіксацыі. У кожным раёне вобласці працуюць па 2 -3 брыгады па прыборцы смецця пры дарогах і на аўтобусных прыпынках. Такія ж прыборы ўсталяваны і ў лясах. Усяго на Мінскую вобласць набылі 82 камеры, 505 таблічак папярэджваюць, што вядзецца відэакантроль. У прысталічным рэгіёне іх, адпаведна, 17 і 52.

Далейшы маршрут — аграгарадок Ратамка, дзе пражывае 2,5 тысячы насельніцтва. Спыняемся непадалёку ад месца прыватнай забудовы.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

АКТУАЛЬНА

Сяргей АШМЯНЦАЎ:

## «З АКНА КАБІНЕТА ШМАТ НЕ ЎБАЧЫШ»

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

**СЁННЯ ў Брэсцкай вобласці праходзіць выязное пасяджэнне прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны. Яго ўдзельнікі засяродзяць увагу на рабоце мясцовых Саветаў рэгіёна, іх ролі ў забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі. Пад апошнім трэба разумець і перспектывы аграпрамысловага комплексу, і стварэнне новых рабочых месцаў, і работу з насельніцтвам, бо дзейнасць дэпутата ў акрузе заўсёды складала аснову работы кожнага Савета. На асаблівай ролі народных выбраннікаў зрабіў акцэнт і старшыня абласнога Савета дэпутатаў Сяргей АШМЯНЦАЎ:**

### Галасуюць не за кожнага

— Для пачатку прывяду тры лічбы. У Брэсцкай вобласці мясцовае самакіраванне прадстаўлена абласным Саветам дэпутатаў, 19 Саветамі базавага ўзроўню і 195 — пярвічнага ўзроўню. А гэта 3039 дэпутатаў. Такой колькасці людзей пад сілу вялікія справы. Мясцовы дэпутат — самае блізкае да людзей звяно прадстаўнічай улады. Ён ведае, што канкрэтна непакоіць жыхароў той ці іншай вёскі. І нярэдка можа дапамагчы свайму выбаршчыку, калі не вырашыць пытанне поўнасцю, то хаця б даць параду, куды і як трэба звяртацца. Дэпутацкі корпус стаў нашай надзейнай апорай на месцах.

***— Сяргей Дзмітрыевіч, перад мінулымі выбарамі ў краіне ўзнімалі пытанне наконт мэтазгоднасці інстытута дэпутатаў пярвічнага ўзроўню. Сапраўды, выбары ў сельскіх Саветах часцей праходзяць безальтэрнатыўна. Таму, відаць, і ўзніклі разважанні, што ёсць сэнс пакінуць у вёсцы толькі сельвыканкамы. А як вы лічыце?***

— Я лічу, што сельскага дэпутата трэба не «скасоўваць», а ўсяляк падтрымліваць, павышаць яго прэстыж. І хоць выбары ў Саветы праходзяць сапраўды практычна без альтэрнатывы, у вёсцы не за кожнага прагаласуюць. Гэта добра ведаюць тыя, хто арганізоўвае кампанію, таму і падбіраюцца ў абсалютнай большасці людзі аўтарытэтныя. Хто, як не дэпутат, паклапоціцца, напрыклад, пра інтарэсы неабароненых катэгорый насельніцтва? Асабліва гэта датычыцца дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. На такіх дзяцей нашы народныя выбраннікі пастаянна звяртаюць увагу і спрыяюць абароне іх правоў.

> **Дэпутацкія групы створаны для вывучэння эканамічнага стану асобных прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў складанай фінансавай сітуацыі.**

Адзначу яшчэ адзін важны момант: многія і многія вёскі, на жаль, старэюць. У асобных населеных пунктах застаюцца адны пажылыя людзі. Любая ўвага да іх з боку прадстаўніка мясцовага органа ўлады мае значэнне. Мы яшчэ раз упэўніліся ў гэтым, калі ў складзе дэпутацкіх груп наведвалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны напярэдадні свята Перамогі. Такія групы былі створаны рашэннем прэзідыума абласнога Савета. Аналагічная работа праведзена і ў рэгіёнах. Там дэпутаты наведалі сваіх ветэранаў. І нязменна чулі падзяку ад пажылых заслужаных людзей за ўвагу. Ім часта найбольш патрэбна менавіта ўвага.

Цяпер дэпутацкія групы створаны для вывучэння эканамічнага стану асобных прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў складанай фінансавай сітуацыі, у Брэсце, Баранавічах, Пінску. Такія ж групы працуюць у раённых цэнтрах. Думаю, што па выніках дзейнасці названыя фарміраванні выкажуць канкрэтныя рэкамендацыі і прапановы па аздараўленні сітуацыі на прадпрыемствах. Да меркавання дэпутатаў прыслухоўваюцца. Арганізацыйную ж і метадычную дапамогу дэпутатам базавага і пярвічнага ўзроўню аказвае абласны Савет.

### Дэпутат, на выезд!

***— Наколькі я ведаю, у практыку работы абласнога Савета даўно ўвайшла такая***



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

***форма работы, як выязная сесія з папярэднім вывучэннем пытанняў на месцах. Гэта сябе апраўдвае?***

— Без усялякіх сумненняў. Абласныя сесіі разглядаюць важныя для паўсядзённага жыцця пытанні — жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя, транспарту, гандлю, бытавога абслугоўвання. Як пералічаныя галіны народнай гаспадаркі функцыянуюць на месцах, з акна кабінета не ўбачыш. Таму мы і едзем у райцэнтры, аграгарадкі, невялікія вёскі: спачатку пытанне вывучаецца на ўзроўні дэпутацкай камісіі. Калі справа таго патрабуе, праводзіцца выязны прэзідыум аблсавета. А ў дзень сесіі са станам работы на месцах знаёмяцца ўсе дэпутаты абласнога Савета. Менавіта падчас стасункаў з насельніцтвам, работнікамі сельгаспрадпрыемстваў і іншых арганізацый можна выверыць сваю пазіцыю, абгрунтаваць тое ці іншае рашэнне. Калі сесіі праходзяць, на першы погляд, гладка, то апошняе не азначае, што не было спрэчак і дыскусій на этапе падрыхтоўкі да іх.

***— На адной з апошніх сесій абласнога Савета гаварылася пра своеасаблівае спаборніцтва сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх Саветаў па вырашэнні пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва. Для чаго заснавалі такі конкурс?***

— Гэта спроба яшчэ раз засяродзіць увагу органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання на самым надзённым. Падставай для ўдзелу ў названым конкурсе становіцца выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі. Улічваецца работа па стварэнні новых рабочых месцаў, прыцягненне ў гаспадарчы абарот зямельных участкаў і маёмасці, якія не выкарыстоўваюцца, арганізацыя работы па развіцці асабістых падсобных гаспадарак і закупак лішкаў сельгаспрадукцыі, прыцягненне даходаў у мясцовы бюджэт, а таксама добраўпарадкаванне і санітарны стан населеных пунктаў.

Напрыклад, сельскія Саветы традыцыйна займаюцца арганізацыяй закупу малака з асабістых падворкаў. Толькі за мінулы год ад насельніцтва закуплена 52 тысячы тон. І прыкладам у рабоце з'яўляюцца Пружанскі і Ляхавіцкі раёны, дзе ў разліку на карову закуплена амаль па тры з паловай тысячы кілаграмаў малака. Пры падвядзенні вынікаў робіцца аналіз указанага кірунку работы, выяўляюцца недахопы і рэзервы, абагульняецца вопыт. Як бачым, пад увагу бярэцца ўсё, з чаго складаецца жыццё тэрыторый. А конкурс — дадатковы стымул да паляпшэння работы.

### Пераканай скептыка

***— Пры падвядзенні вынікаў конкурсаў, відаць, улічваецца і наяўнасць арганізацый і суполак грамадскага самакіравання?***

— Вядома, тым больш што грамадскіх актывістаў у гарадах і вёсках з кожным годам становіцца больш. Дамавыя, вулічныя і іншыя камітэты арганізоўваюць мерапрыемствы па добраўпарадкаванні і прыборцы тэрыторый, спрыяюць беражлівым адносінам да жылля, наладжваюць работу з дзецьмі і падлеткамі, робяць шмат іншых добрых спраў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

### Павага да майстэрства

**Пра гарадскіх рамеснікаў Гродзенскі гарвыканкам паклапаціўся ў рамках сумеснага праекта з мэрыяй Даўгаўпілса па Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Латвія — Літва — Беларусь».**

Беларускую частку праекта прафінансавалі са сродкаў Еўрасаюза (больш за 400 тысяч еўра), а таксама мясцовага бюджэту. Створаны выдатныя ўмовы для гарадскіх рамеснікаў самага рознага профілю — у іх распараджэнні майстэрні, выставачныя залы, а для фальклорных святаў пабудавалі невялікі амфітэатр. Мяркуецца, што ва ўсіх зацікаўленых будзе магчымасць не толькі пазнаёміцца з народнымі ўмельцамі, набыць іх вырабы, але і павучыцца ў вопытных майстроў саломапляцення, шыцця, ганчарства і іншых рамёстваў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### Сюрпрыз для закаханых

**Лаўка закаханых вагой пад 200 кілаграмаў з'явіцца ў Полацку ў Дзень горада.**

— У рамках праекта «Полацк маладзёжны» для ўсіх закаханых будзе прэзентавана сімвалічная лаўка. Гэта адбудзецца 7 чэрвеня ў 12.00 ля будынка ЗАГСа. Зроблена канструкцыя за кошт добраахвотных ахвяраванняў моладзі Полаччыны. Аўтар — вопытны каваль Аляксей Калеснікаў з вёскі Фарынава. Яго вырабы ўжо добра ведаюць не толькі ў Беларусі, але і суседняй Расіі, — распавяла **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама.**

Аўтары ідэі спадзяюцца, што калі закаханыя пасядзяць, абняўшыся на той лаўцы, то ў сямейным жыцці ў іх усё будзе выдатна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

СВОЙ СЯРОД СВАІХ

# РАЗМОВА З ІНСПЕКТАРАМ... ПА ДУШАХ

***Старшы ўчастковы Аляксандр Радкевіч — пра спецыфіку сваёй працы, заганы мясцовых жыхароў і веру ў людзей***

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

**Аграгарадок Буйнічы, дзе ён працуе старшым участковым, амаль што прыгарадная тэрыторыя. З Магілёва сюды ідзе грамадскі транспарт. Тут каледж, заасад, этнаграфічная сядзіба, мемарыяльны комплекс — народа пераварочваецца процьма. Прыязджаю, выходжу на звычайным прыпынку і тэлефаную: дзе, маўляў, вас шукаць. «А я вас ужо бачу, спускайцеся ў падземны пераход, сустрэну», — адказвае чалавек, які нават не ведае мае «прыкметы». «Гэта ўжо інтуіцыя, — прызнаўся ён потым. — Да таго ж усіх мясцовых я даўно ведаю ў твар».**

На самай справе, за 25 гадоў працы на адным месцы старшы ўчастковы Магілёўскага РАУС Аляксандр Радкевіч не тое, што ў твар, ён чалавека наскрозь бачыць. Малыя яго тут проста дзядзькам Сашам клічуць. У міліцыю, як ён кажа, прыйшоў працаваць па «камсамольскай пуцёўцы». Служыў у пагранвойсках, а калі прапанавалі працягнуць службу ў органах, доўга не раздумваў. Калісьці ў дзяцінстве наглядзеўся «Аніськіна» і марыў быць міліцыянерам.

— Дэбашыраў выхоўваем, п'яных возім, — дзеліцца Радкевіч нюансамі прафесіі і ўсміхаецца, узгадваючы адзін з першых працоўных выпадкаў. Ён тады моцна пацярпеў ад сямейных скандалістаў. Так здарылася, што падчас свайго бальнічнага зайшоў у апорны пункт па справах, а яму прапанавалі схадзіць супакоіць раз'юшанага сем'яніна. І Аляксандр з гіпсам на руцэ пайшоў. У скандаліста, калі ўбачыў «госця», кроў яшчэ больш ускіпела: палюбоўнік, крычыць, і на яго з кулакамі. Ледзь адбіўся, а там і дапамога прыбыла. Шкада толькі куртку было — ад яе адны ўспаміны засталіся.

Першае пачуццё, якое выклікаюць п'яніцы і іншыя асацыялы ў звычайных людзей, — гідлівасць. Але Аляксандр Радкевіч абсалютна з гэтым не згодны. Адкуль мы ведаем, як чалавек да гэтага ўзроўню апусціўся? Да кожнага трэба мець падыход, лічыць ён, і размаўляць на яго мове.

— Я з імі гуляю ў іх гульню, — кажа ён. — Магу падтакваць, але гну сваю лінію. Здаралася, трэба было супакоіць раз'юшанага чалавека, а яго ўсе баяцца. Навошта баяцца? З ім па-добраму паразмаўляеш — і ён сам сядзе ў машыну. Проста трэба зрабіць выгляд, што ты на яго баку... Як з тымі былымі «афганцамі». Пілі яны тут аднойчы гарэлку, а потым буяніць пачалі. Адзін наогул быў без тармазоў, ледзь справіліся з ім. Вязём у машыне, а ён паводзіць сябе па-хамску. «Ты што, дэсантнік? — пытаюся. — Я ж таксама». І некалькі іх слоганаў прадэкламаваў. Ён адразу ж прыняў за свайго і супакоіўся.



Да кожнага чалавека трэба знайсці падыход.

Хаця бываюць выпадкі, калі людзі добрых слоў не разумеюць. Аднойчы нават з дапамогай зброі прыйшлося пераконваць. Але там справа была сур'ёзней, чым звычайны бытавы скандал. У пачатку 90-х зладзеі панадзіліся красці паліва з нафтабазы. Радкевіч некалькі гадзін сядзеў у засадзе, каб іх высачыць. Нарэшце, пад'ехалі «Жыгулі», выйшлі некалькі чалавек. Раптам убачылі міліцыянера, кінуліся назад у машыну і наўцёкі. Давялося некалькі разоў пальнуць у паветра, каб спыніліся.

Быць абыякавым Аляксандру Радкевічу сумленне не дазваляе. Людзі звяртаюцца да яго з усялякімі праблемамі. Свой тэлефон ён ніколі не адключае. Калі сам не можа прыйсці, падказвае, як дзейнічаць. Асноўная праблема — сямейныя скандалы. Прыходзіцца дапамагаць, уздзейнічаць. Бывае, людзі перавыхоўваюцца.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

# ПАРУШАЛЬНІКАЎ — НА СТЭНД!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Менавіта тут мы абсталявалі кантэйнерную пляцоўку, дзе прадугледзелі збор цвёрдых бытавых адходаў, другасных матэрыяльных рэсурсаў. А таксама дадаткова ўстанавілі кантэйнер для будаўнічых адходаў, — паказвае намеснік старшыні Мінскага райвыканкама Уладзімір Юргевіч. — Тут узводзіцца шмат індывідуальных дамоў. Раней людзі ладзілі стыхійныя несанкцыянаваныя звалкі, даводзілася расчышчаць тэрыторыю з дапамогай камунальнікаў, прыцягваць іншыя арганізацыі. Цяпер тут чысціня і парадак.

Усяго ў Мінскім раёне ўсталявана каля 50 кантэйнерных пляцовак, і работа ў гэтым напрамку працягваецца. Неабходна забяспечыць установку кантэйнерных пляцовак і ў садаводчых таварыствах, якіх у раёне 318. Толькі за апошні час раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя вынесла ім прадпісанняў і пастаноў нам суму каля 200 млн рублёў.

У Заслаўі нас сустракае старшыня гарвыканкама Святлана Карташова.

У 2014 годзе ў горадзе прайшло свята — Дзень беларускага пісьменства. Зразумела, тут была праведзена вялікая работа па добраўпарадкаванні населенага пункта, вуліц і дваровых тэрыторый. Цяпер важна не толькі захаваць усё тое, што прыведзена ў парадак, але і прадоўжыць працу. Тут створана рабочая група па навядзенні парадку, прылеглыя тэрыторыі замацаваны за прадпрыемствамі і арганізацыямі. Цяпер арыентуем кіраўнікоў уладкоўваць і грамадскія месцы.

Як адзначыла Святлана Пятроўна, з пачатку года складзена 50 пратаколаў на ўласнікаў прыватных дамоў і 23 — на юрыдычных асоб. Каля гандлёвых аб'ектаў пачалі размяшчаць стэнды, дзе пазначаны не толькі найлепшыя, але і найгоршыя сядзібы. Вядома, ёсць пакрыўджаныя. Але гэта вельмі дзейсны сродак барацьбы з безгаспадарлівасцю.

— І тут незаменныя памочнікі: органы грамадскага самакіравання, дэпутаты, участковыя інспектары. Гэта наш актыў, які здольны дайсці да кожнага чалавека, прымусіць навесці парадак на падворку і прылеглых тэрыторыях.

А вось яскравы «ўзор» безгаспадарлівасці — садаводчае таварыства «Вішанька», куды мы зазірнулі. Розны хлам складзіруецца наўпрост каля агароджаў. Мала таго, што тут не хапае кантэйнераў для буйнагабарытных адходаў, дык яшчэ і не заключаны дагавор на вываз смецця. Жыхары апраўдваліся: маўляў, не ўдалося сабраць членаў таварыства на суботнік, які хацелі зладзіць, часта мяняюцца старшыні таварыства. Вось і на днях знялі былога, а новага яшчэ не выбралі. Тым не менш, парадак наводзіць усё ж давядзецца ў тэрмін, вызначаны для ліквідавання парушэнняў.

Як паказаў рэйд, частка нашых грамадзян усё яшчэ жыве састарэлымі паняццямі накшталт таго, што прыбіраць смецце, наводзіць бляск у населеных пунктах павінны камунальныя службы і сельскі Савет. Але нагадаю: чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе не смецяць... Знешні выгляд сядзіб, паселішчаў, месцаў агульнага карыстання — візітоўка населенага пункта, паказчык узроўню культуры людзей, што там пражываюць.

# РАЗМОВА З ІНСПЕКТАРАМ... ПА ДУШАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Быў тут адзін такі, дапіўся да таго, што давялося адправіць у ЛПП, — расказвае ён. — Трэба яго везці, а ў мяне як на тое зло машына зламалася. Цэлую ноч мы з ім яе рамантавалі, а раніцай я яго павёз. Год не было, потым бачу — ідзе і... п'яны-п'яны. Мы з ім тады па душах паразмаўлялі, і ён паабяцаў: месяц п'ю, а потым завязваю. І слова стрымаў. Прычым сам адмовіўся, без кадзіроўкі. Рыбак добры, зараз, калі сустракаемся, толькі на гэтую тэму і размаўляем. Перавыхаванне — вялікая справа, але і сіла волі павінна быць.



Аляксандр РАДКЕВІЧ — свой чалавек у Буйнічах.

Старшыня сельскага Савета не аднойчы запрашаў Радкевіча наведаць асацыяльныя сем'і ў іншых вёсках. Там ёсць свае ўчастковыя, але з «буйніцкім» лягчэй дамовіцца. А ён, бывае, і сам да дэпутатаў звяртаецца, калі заўважае непарадак на вуліцы. Убачыў недзе звалку, тэлефануе ў сельскі Савет: давайце прыбяром. Старшыня заказвае тэхніку, а Радкевіч яшчэ і пагрузіць дапаможа. «А што тут такога, — паціскае плячыма ён, — я ж тут таксама жыву. Вось параіў звярнуць увагу на дрэнную дарогу да могілак — трэба нешта рабіць. Пакуль магчымасці няма, але, як кажуць, пытанне на кантролі».

Прывык участковы і да таго, што з некаторымі людзьмі адносіны псуюцца. Адна жанчына пакрыўдзілася за тое, што яе сына пакаралі пазбаўленнем волі. Нават скаргу напісала. «Я яе колькі разоў папярэджваў, каб глядзела хлопца, — уздыхае суразмоўца. — Нікога не паважаў, «адрываўся» па поўнай праграме, біўся... Падлеткам прыводзілі яго ў апорны пункт, а ён ужо тады паводзіў сябе нахабна. Бацькі прыходзілі яго забіраць, а ён і на іх па-ўсякаму. А калі падрос — крадзяжы пайшлі, п'яным за рулём не аднойчы затрымлівалі. Яму на ўсё было напляваць... Цяпер вось за кратамі».

Не абышла бокам Буйнічы і ўсеагульная бяда са спайсамі. Летась паступіў званок, што каля фермы з «Волгі» спайс прадаюць. Участковы з інспектарам па справах непаўналетніх памчаліся да месца. Прыехалі — а там нікога няма. Пачалі шукаць. Па дарозе сустрэлі мясцовых юнакоў. Радкевіч здзівіўся: «А вы што тут робіце?» Тыя ў адказ: «Гуляем». І гэта ў 11 гадзін у бязлюдным месцы. Спачатку адпусцілі іх, але нешта ўчастковаму падказала: гэта яны. Не паленаваўся вярнуцца. А тыя, як убачылі, што іх даганяюць, нешта кінулі ў снег... Хлопцаў затрымалі, а калі прыехала аператыўная група, той пакецік стаў рэчавым доказам. Унутры аказаўся спайс.

— Дзесьці людзей шкада, бывае, чалавек заблытаўся, яму трэба дапамагчы, — разважае буйніцкі ўчастковы. — Дзесьці, магчыма, трэба і пакараць. Але гэта не найлепшы варыянт. Трэба пераконваць. Ведаеце, я ў апошні час больш стаў верыць людзям.

> **Бываюць выпадкі, калі людзі добрых слоў не разумеюць. Аднойчы нават з дапамогай зброі прыйшлося пераконваць.**

Каб працаваць участковым, трэба прайсці армію, патрульную службу. У арміі сталееш, а ў патрульнай вучышся кантактаваць з людзьмі. А маладыя, здараецца, сюды прыходзяць, каб у армію не ісці. Два гады пабудуць і збягаюць.

Сёлета старшага ўчастковага вылучылі нават на званне «чалавека года» ў вобласці. З гэтай нагоды ён нос на задзірае, сціпла заўважае, што не заслужыў такую павагу. Але прызнаецца, што прыемна было чуць добрыя словы. Губернатар павіншаваў і ўручыў сертыфікат на новую службовую машыну «Джылі». Радкевіч задаволены, бо яго «Жыгулі» даўно аджылі сваё жыццё. «Цяпер наш Аляксандр будзе як сапраўдны шэрыф штата Буйнічы», — радуецца за таварыша яго сябар, які працуе ў музейным комплексе ў Буйнічах. І прызнаецца, што ўчастковага, лепшага за Аляксандра, бачыць яму яшчэ не даводзілася.

**ЧЫМ БАГАТЫЯ**

# У СУРАЖ... НА РЫБАЛКУ

**Гарадскі пасёлак Сураж Віцебскага раёна калісьці быў райцэнтрам. Летась тут адсвяткавалі 450-ю гадавіну першага ўзгадвання населенага пункта ў летапісе. На жаль, да нашых дзён не захаваліся дарэвалюцыйныя будынкі, адпаведна, няма помнікаў архітэктуры. Таму і турыстаў тут пакуль няшмат.**

— Затое ў Суражы ёсць усё для паўнавартаснага жыцця. Я маю на ўвазе школу, дзіцячы садок, банк, пошту, амбулаторыю, філіялы музычнай школы і раённага Дома творчасці і гэтак далей, — распавядае **старшыня Суражскага сельскага Савета Аляксандр ВЯЛІТЧАНКА.**

У населеным пункце размяшчаецца аддзяленне адаптацыі, рэабілітацыі і дзённага знаходжання інвалідаў. Ёсць і дом «экстраннага» знаходжання пенсіянераў, для састарэлых, якіх трэба даглядаць. Пры гэтым яны плацяць толькі за камунальныя паслугі і электрычнасць. Каля 30 сацыяльных работнікаў абслугоўваюць больш за 200 чалавек на даму. У сацыяльным пункце пенсіянеры па даступных расцэнках могуць скарыстацца паслугамі пральні і швейнай майстэрні. І матарызаваную касу можна ўзяць на пэўны час. Гэта ўсё стала магчымым дзякуючы ў тым ліку і мецэнатам з Еўропы, з якімі наладжаны трывалыя сувязі.

А калі ў пенсіянера ёсць прысядзібны ўчастак, хто акажа дапамогу? Кіраўнік улады растлумачыў, што КУПа па аказанні такіх паслуг у Суражы няма. Але выручаюць аграрыі.

— Колькасць асабістых гаспадарак у нас скарачаецца. Напрыклад, кароў тутэйшыя трымаюць на сёння толькі 44, а яшчэ два гады таму, для параўнання, іх было 100, — канстатуе суразмоўца.

У Суражы ёсць і шматкватэрны дом. Разам з ім на балансе камунальнікаў знаходзяцца дамы сядзібнага тыпу, пабудаваныя яшчэ ў 1940-я гады. Адным патрэбны цякучы рамонт, іншым — капітальны...

Але ж уладзе, каб вырашаць праблемы людзей, патрэбны сродкі. Якія асноўныя крыніцы даходаў у канкрэтна ўзятым сельсавеце?

— Можна нядрэнна зарабіць на продажы зямельных участкаў. Грошы ад гэтага ідуць на наш рахунак. Толькі летась выканкам такім чынам атрымаў 68 мільёнаў рублёў. Для параўнання: на добраўпарадкаванне сельсавета на гэты год з раённага бюджэту прадугледжана фінансаванне ў памеры 30 мільёнаў рублёў... А ў астатнім, як той сказаў, трэба самім круціцца, каб грашовыя паступленні былі. Напрыклад, штогод збіраем ад насельніцтва 4 мільёны рублёў добраахвотных узносаў. Папаўняе бюджэт і падаходны падатак... Мы з радасцю падтрымаем тых, хто захоча займацца турызмам, — паабяцаў Аляксандр Вялітчанка. — Прымалі б гасцей з начлегам, пракатам інвентару рыбалоўнага, лодак. Недалёка цудоўны пляж, бадай, толькі на моры пясок такі. Калі б нехта пачаў развіваць турыстычную інфраструктуру, вялікія, напэўна, грошы мог бы зарабіць. Віцебск адсюль недалёка, і Расія побач. Стварыць бы дастойныя ўмовы — тыя ж гараджане з задавальненнем сюды прыязджалі б. У гэтых мясцін вялікая турыстычная будучыня, і гэты патэнцыял трэба развіваць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

# «З АКНА КАБІНЕТА ШМАТ НЕ ЎБАЧЫШ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Напрыклад, у Баранавічах заслужаным аўтарытэтам карыстаецца камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея». Сёння ў межах гэтага грамадскага аб'яднання пражывае ўжо каля пяці тысяч чалавек. «Надзея» мае свой рахунак у банку, на які паступаюць грошы, сабраныя жыхарамі. Дзякуючы «Надзеі» за апошнія два гады памяняўся знешні выгляд пад'ездаў, дваровых тэрыторый, ды і ўсяго мікрараёна. Падобныя аб'яднанні ўжо працуюць у Пінску, Кобрыне і Брэсце.

> **Калі сесіі праходзяць, на першы погляд, гладка, то гэта не азначае, што не было спрэчак і дыскусій на этапе падрыхтоўкі да іх.**

А ўзяць такую складовую грамадскага самакіравання, як інстытут стараст, які быў створаны ў 1997 годзе. За гэты час старасты заслужылі павагу і давер людзей. Вясковыя лідары спрыяюць навядзенню і падтрыманню парадку. Яны становяцца ініцыятарамі збору грошай на агульныя справы. Сёння 93 працэнты населеных пунктаў удзельнічаюць у цэнтралізаваным вывазе смецця транспартам ЖКГ. І ў гэтым ёсць заслуга стараст, якія размаўлялі з жыхарамі, пераконвалі. У гэтай рабоце трэба было дайсці да кожнага, хто сумняваўся альбо прывык дзейнічаць па інерцыі, пераканаць скептыкаў. У кожным раёне можна знайсці прыклад ініцыятыўнага старасты. І не аднаго.

***— А хто дапамагае старастам, ды і дэпутатам сельскіх і раённых Саветаў у рабоце з насельніцтвам?***

— У практыцы вырашэння паўсядзённых праблем насельніцтва, яго інфармавання добра зарэкамендавалі сябе «Дні Саветаў». У гэтым мерапрыемстве ўдзельнічаюць старшыні раённага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта, начальнікі ўпраўленняў і службаў, аддзелаў райвыканкама, старасты вёсак і, вядома, жыхары населеных пунктаў. Там не проста слухаюцца справаздачы адказных асоб, а ідзе адкрыты дыялог з мясцовымі жыхарамі па ўсіх важных для іх пытаннях. На такіх «Днях Саветаў» і намячаецца пералік пытанняў, абавязковых для вырашэння ў гэтым рэгіёне.

Што датычыцца дэпутатаў і актывістаў раённага ўзроўню, яны ўдзельнічаюць у выязных нарадах-семінарах органаў кіравання і самакіравання з удзелам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. За перыяд з 2007 года такія нарады прайшлі на базе ўсіх раёнаў вобласці.

**НАВІНЫ З РЭГІЁНАЎ**

## Бераставіца

### УРОК ГІСТОРЫІ

**Актывісты гісторыка-краязнаўчага музея «Вытокі» Малабераставіцкай сярэдняй школы запрасілі на сустрэчу мясцовых жыхарак.**

Ініцыятар стварэння і кіраўнік музея Тамара Эйсмант прадставіла вучням старэйшых класаў Рамуальду Сцяпанаўну Глябовіч, Зою Аркадзьеўну Бараноўскую, Ніну Мікалаеўну Гоганаву і Галіну Іванаўну Галабурду — сведкаў Вялікай Айчыннай вайны. Амаль дзве гадзіны дзеці, затаіўшы дыханне, слухалі іх успаміны. А развітваючыся з гасцямі, уручылі ім кветкі і падарункі.

Усё ў музеі «Вытокі» звязана з гісторыяй Бераставіччыны, лёсам мясцовых жыхароў. Тут захоўваюць фатаграфіі, асабістыя рэчы франтавікоў, узнагароды, лісты... Пайменна названы ўраджэнцы гэтых мясцін, якія загінулі на фронце і вярнуліся дадому, падпольшчыкі і ахвяры фашызму.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



## Полацк

### ...І БЕЛЫ ЦЕПЛАХОД

**Цеплаход «Віцебск», які курсіруе паміж Полацкам і Наваполацкам, стаў папулярным месцам адпачынку.**

У Полацкім райвыканкаме адзначаюць, што судна карыстаецца вялікім попытам сярод гараджан і прыезджых. І гэта зразумела, бо доўгія гады не было ў Полацкім рэгіёне пасажырскага цеплахода. Цікава, што адразу, як толькі «Віцебск» прыплыў сваім ходам па Заходняй Дзвіне з абласнога цэнтра, пачаўся ажыятаж. Плануецца, што судна будзе працаваць у Полацку і Наваполацку да сярэдзіны чэрвеня... Кошт падарожжа па хвалях даступны кожнаму: 50 тысяч за гадзіну з дарослага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**

## Ельск

### САПРАЎДЫ ПРЫГОЖАЯ!

**Аграсядзіба «Васіліса Прыгожая» адкрылася ў вёсцы Жукі Ельскага раёна. Сям'я Алены і Пятра Лагвіненкаў вярнулася ў родную вёску, каб адрадзіць былую бацькоўскую хату.**

Сужэнцы надалі ёй сучасны выгляд і стварылі вакол своеасаблівы гасцінічны комплекс — аграсядзібу. Назвалі яе ў гонар роднай цёткі Алены — Васілісы Васільеўны Прохаравай, якая прайшла праз вайну і сустрэла Вялікую Перамогу ў Берліне.

У вялікім доме — чатыры жылыя пакоі. Замест былой гаспадарчай пабудовы дбайныя гаспадары стварылі своеасаблівы музей «Прылады нашых продкаў». На тэрыторыі аграсядзібы пабудавана канцэртная пляцоўка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Лоеў

### СПІЦЬ СПАКОЙНА

**На Лоеўшчыне, пераадолеўшы 6000 км, пабывала дэлегацыя з Мегіна-Кангаласкага ўлуса Якуціі.**

Да брацкай магілы ў вёску Дзяражычы пакланіцца пахаванню Героя Савецкага Саюза Фёдара Папова прыехалі яго нашчадкі-землякі. Фёдар Папоў быў цяжка паранены ў кастрычніку 1943 года ля вёскі Глушэц Лоеўскага раёна і памёр у шпіталі ва ўзросце 22 гадоў. На вечары сустрэчы было сказана шмат добрых слоў у адрас беларусаў, якія паважаюць памяць загінулых, падтрымліваюць парадак і рамантуюць помнікі. Асобную падзяку госці выказвалі Афанасію Шкляраву, які на працягу свайго жыцця не проста вывучае гісторыю Вялікай Айчыннай вайны на Лоеўшчыне, але і сваімі рукамі стварыў помнік у вёсцы Глушэц.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Воранава

### НЕБЯСПЕЧНЫЯ

**Няпростае, але вымушанае рашэнне прынялі члены камісіі па справах непаўналетніх Воранаўскага райвыканкама на выязным пасяджэнні ў Жырмунскім сельсавеце.**

Мясцовая жыхарка пражывала разам з непаўналетнім сынам і сужыцелем. Дом неўпарадкаваны, адзін пакой ды кухня. Але яшчэ горш тое, што маці было напляваць на свае абавязкі па выхаванні хлопчыка. П'яныя дэбошы прымушалі яго нават збягаць з дому.

Нядаўна жанчыну накіравалі лячыцца ад алкагольнай залежнасці і яна вярнулася дадому быццам бы іншай. Ужо было даволі рэальным пазбаўленне гэтай сям'і статусу сацыяльна небяспечнай. Але тут ізноў — п'янкі, скандалы, звальненне з працы... Адміністрацыі Жырмунскай школы не заставалася нічога іншага, акрамя звароту ў раённую камісію па справах непаўналетніх. Падлетка накіравалі ў Радунскі сацыяльна-педагагічны прытулак.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**ПРАФІЛАКТЫКА**

# ТЭРЫТОРЫЯ БЯСПЕКІ

## На Гомельшчыне змагацца з пажарамі дапамагаюць добраахвотныя дружыны

**З пачатку года ў вобласці на пажарах загінулі 40 чалавек. Гэта, вядома, не мала, але ж на 10 менш, чым за той жа час летась. Значыць, не дарма працавалі не толькі падраздзяленні МНС, але і органы мясцовага самакіравання, і добраахвотныя пажарныя каманды...**

Не спыняцца і надалей шукаць спосабы, якімі можна ўздзейнічаць на грамадзян, каб прадухіляць надзвычайныя сітуацыі — такая задача была сфармулявана падчас выязнога пасяджэння прэзідыума Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў і ўпраўлення МНС.

— З 2012 года на тэрыторыі нашага сельсавета не было пажараў з гібеллю людзей. Як кіраўнік назіральнай камісіі, магу сказаць, што мы пастаянна праводзім работу па прафілактыцы надзвычайных сітуацый, — кажа старшыня Урыцкага сельскага Савета дэпутатаў Любоў Браўкова. — Зараз мы сканцэнтраваліся на рабоце з асацыяльнымі асобамі. Мы пастаянна камісійна абследуем іх жыллё. Сёлета падчас рэйду выявілі 25 беспрацоўных, пасля чаго частка з іх стала на ўлік у цэнтр занятасці, іншыя працаўладкаваліся, а кагосьці рыхтуем да адпраўкі ў ЛПП. Імкнёмся звярнуць увагу людзей на небяспечныя скруткі праводкі, пробкі з «жучкамі». Нядаўна быў выпадак: мы прыйшлі да грамадзяніна, калі ў хаце была ўцечка газу і ў памяшканнях павысілася яго канцэнтрацыя. Мы адразу ж выклікалі аварыйную службу і гэтым прадухілілі гібель чалавека.

Удзельнікі выязнога пасяджэння Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў пазнаёміліся з работай добраахвотных пажарных каманд — дружыннікі сельгаскамбіната «Усход» прадэманстравалі свае навыкі тушэння пажараў. Фарміраванне такіх каманд на базе мясцовых прадпрыемстваў на тэрыторыі Гомельскай вобласці пачалося тры гады таму, і за гэты час яны пацвердзілі сваю неабходнасць. У выпадку надзвычайных сітуацый дружыннікі рэагуюць першымі, аказваюць дапамогу, асабліва ў аддаленых населеных пунктах.

> ***З 2013 года ў Гомельскай вобласці створана ўжо 165 добраахвотных пажарных фарміраванняў. Іх задачай з'яўляецца выезд на пажар і стрымліванне яго развіцця да прыбыцця пажарных падраздзяленняў. За час свайго існавання добраахвотныя каманды прынялі ўдзел у ліквідацыі 257 пажараў.***

— Дыслакацыя падраздзяленняў МНС не заўсёды дазваляе забяспечыць надзейную супрацьпажарную абарону асобных сельскіх населеных пунктаў, — кажа **начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Аляксандр УКРАІНЕЦ.** — А такія добраахвотныя каманды пачынаюць дзейнічаць на ранняй стадыі ўзнікнення пажару, бо знаходзяцца побач. У вобласці налічваецца больш за 2,6 тысячы населеных пунктаў, з іх палова — па-за радыусам выезду нашых падраздзяленняў, гэта значыць, далей за 10 км. Таму тэма стварэння добраахвотных пажарных каманд вельмі актуальная.

**Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА** згодны, што сёння многія пажары ў аддаленых кутках вобласці лепш і хутчэй могуць лакалізаваць менавіта грамадскія пажарныя дружыны:

— Мы імкнёмся стварыць іх у кожным раёне і дзейнасць гэтую прывесці да прафесійнага ўзроўню. Каб людзі праходзілі навучанне і перападрыхтоўку, каб кіраўнікі прадпрыемстваў давалі гэтым людзям дадатковыя дні адпачынку, аказвалі ім пэўную матэрыяльную дапамогу. Дарэчы, аналагічныя каманды існавалі ў Савецкім Саюзе. Такім чынам арганізавана работа пажарных-добраахвотнікаў у еўрапейскіх краінах. Людзі, якія задзейнічаны ў рабоце па прафілактыцы і тушэнні пажараў, добра ведаюць, як правільна сябе паводзіць, і іншых арганізаваць на гэтую справу. Магчыма, хутка ў аддаленых сельсаветах пры невялікіх узгараннях увогуле не трэба будзе задзейнічаць сілы і сродкі МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.117. Нумар падпісаны ў 19.30 26 мая 2015 года.**



# Распускайся, квітней, «Вясновы букет»!



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Вясновы букет» — сапраўднае ўпрыгажэнне гэтага сталічнага куточка. Свята цэлы год чакалі найлепшыя майстры краіны, члены Беларускага саюза народных майстроў, а таксама наведвальнікі гэтага ўнікальнага кірмашу. І ўсе дружна адзначаюць: у такім фармаце лепшага за Лошыцкі фестываль у нашай краіне кірмашу майстроў няма. Напрыканцы мая, калі прырода выглядае, як суцэльны букет, творцы гатовыя паказаць свае набыткі, сустрэцца ў коле такіх самых апантаных і працавітых у трацыдыйных справах. Тут і кавалі са сваімі звонкімі кавадламі, ганчары і керамісты з найлепшымі глінянымі вырабамі, вышывальшчыцы і ткаллі на фоне, не пабаюся сказаць, сваіх шэдэўраў народнага мастацтва. Гэта той самы пленэр пад адкрытым небам (насамрэч, пад сонцам), калі майстры ў атачэнні сваіх работ працягваюць займацца любімай справай: пляцельшчыкі плятуць з лазы і саломы, інкрустатары і мастакі па маляванні дываноў — малююць, лыжкары і разьбяры — выразаюць, бондары — бандарацьь, майстрыхі лялек і народнага адзення — вышываюць, чараўнікі выцінанак — выразаюць, ткаллі паясоў — ткуць. Амаль усе віды народнай творчасці і рамяства былі прадстаўлены на гэтым вясеннім вернісажы.

У асаблівым горадзе майстроў, якія размясціўся вакол сучаснай паркавай плошчы, на якой часта праходзяць забаўляльныя мерапрыемствы, раённыя дамы мастацтваў ад абласцей занялі свае традыцыйныя (ужо не першы год яны тут «кватаруюць») месцы. На гэтых вуліцах рамеснікаў і майстроў гуляюць цікаўныя пакупнікі — сотні, калі не сказаць тысячы.

У немалой ступені святочны настрой на кірмашы падтрымлівалі музыкі і самадзейныя артысты, таксама сапраўдныя майстры сваёй справы.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**





Даты | Падзеі | Людзі

**27 МАЯ**

**1836** год — нарадзіўся (Літва) Ян Карловіч, польскі лінгвіст, этнограф, фалькларыст, музыказнавец. Акадэмік Акадэміі ведаў у Кракаве (1887). У 1871—1882 гг. жыў і працаваў у Беларусі. Збіраў і запісваў беларускія народныя казкі і іншыя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. У кнізе «Народныя паданні і казкі, сабраныя ў Літве» змясціў у перакладзе на польскую мову больш за 80 беларускіх легенд, паданняў і казак, якія запісаў у Лідскім і Навагрудскім паветах. У 1889 і 1891 гадах запісаў для М. Федароўскага больш за 500 мелодый беларускіх песень. У часопісе «Вісла» публікаваў беларускія фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Прызнаваў за беларусамі права на самастойнае развіццё, заклікаў вучоных даследаваць беларускую мову, фальклор, народны побыт. Перапісваўся з беларускімі навукоўцамі, сябраваў з Ф. Багушэвічам. Памёр у 1903 годзе.



**1905** год — 110 гадоў таму нарадзіўся (вёска Макашы, цяпер Нясвіжскі раён) Уладзімір Жылка, беларускі паэт. Аўтар паэтычных зборнікаў «На ростанях», «З палёў Заходняй Беларусі» і іншых. Перакладаў на беларускую мову творы М. Лермантава, А. Міцкевіча, Г. Ібсена, іншых замежных аўтараў. У 1930 годзе быў арыштаваны і высланы ў горад Уржум. Там ён і памёр у 1933-м. У 1960 годзе рэабілітаваны.

**1905** год — у Японскім моры паміж расійскімі і японскімі эскадрамі пачалася Цусімская бітва, адна з найбольш трагічных старонак у рускай ваеннай гісторыі. Гэта была апошняя, вырашальная марская бітва Руска-японскай вайны 1904-1905 гадоў, у ходзе якой руская эскадра была цалкам разгромлена. Большая частка рускіх караблёў была патоплена японцамі або экіпажамі сваіх караблёў, частка капітулявала, некаторыя інтэрнаваліся ў нейтральных партах. І толькі чатыром караблям удалося дайсці да рускіх партоў. Усяго асабовага складу расійскай эскадры перад бітвай было 16 170 чалавек, з іх толькі 870 прарваліся ва Уладзівасток. Нягледзячы на ўнушальную перамогу, Японія сама была знясілена вайной. Таму і Расія, і Японія імкнуліся да міру. У ліпені 1905 года ў амерыканскім горадзе Портсмуце пачаліся перамовы, якія скончыліся падпісаннем мірнага дагавора, што ўсталёўваў дамінуючае становішча Японіі ў Карэі. Таксама да Японіі адыходзіла паўднёвая частка вострава Сахалін і перадаваліся арэндныя правы Расіі на Порт-Артур.

**Было сказана**

**Таіса БОНДАР, паэтэса:**
*Ідзеш, пакуль вядзе дарога,*
*Жывеш, пакуль не сплакаў слёз.*

■ Суайчыннікі ў свеце

# Радзіма яднае

## Чым жывуць беларусы ў Расіі

**За мяжой пражываюць каля трох мільёнаў выхадцаў з нашай краіны, прычым 520 тысяч — у Расійскай Федэрацыі. На сёння гэта найбуйнейшая беларуская дыяспара ў свеце. Для таго, каб мець адзіны прадстаўнічы орган нашых суайчыннікаў у суседняй краіне, у 1999 годзе была створана Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія (ФНКА) «Беларусы Расіі». Карэспандэнт «Звязды» даведалася, наколькі аб'яднана беларуская дыяспара.**

### СУСТРЭЧА ДОБРЫХ СЯБРОЎ

На шосты з'езд беларусаў Расіі ў Маскоўскі дом нацыянальнасцей прыехалі 54 дэлегаты, а таксама 25 ганаровых гасцей. Многія з удзельнікаў пакінулі Беларусь шмат дзесяцігоддзяў таму. Расія ўжо даўно стала іх другой радзімай, але ў сэрцах іх жыве шчымлівая туга па родным краі, а ў свядомасці замацавалася непахіснае перакананне, што яны — беларусы. І гэта падштурхоўвае іх успамінаць родную беларускую мову, шанаваць нацыянальную культуру і адраджаць традыцыі продкаў у тых рэгіёнах, у якіх яны апынуліся па волі лёсу.

Дэлегаты віталіся, фатаграфаваліся, абменьваліся візітоўкамі, кнігамі і брашурамі, якія выдаюцца іх дыяспарамі. Актавая зала Дома нацыянальнасцей нагадвала месца сустрэчы добрых сяброў.

Афіцыйны пачатак мерапрыемству даў абраны падчас мінулага з'езда (у красавіку 2010 года) старшыня Савета ФНКА Валерый Казакоў. Пасля гэтага прывітальнае слова ад імя міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея зачытаў саветнік-пасланнік Пасольства Беларусі ў Расіі Павел Лёгкі. «Рэспубліка Беларусь ганарыцца сваімі суайчыннікамі, якія не толькі не згубілі сваіх нацыянальных каранёў і захавалі сувязь з Айчынай, але і дасягнулі поспехаў у творчай, грамадскай і іншай дзейнасці Расійскай Федэрацыі», — было сказана ў пасланні. У звароце міністра таксама было падкрэслена, што наша краіна на самым высокім узроўні з вялікай увагай ставіцца да ўмацавання сувязяў з беларусамі за мяжой, пра што сведчыць прыняцце летась Закона «Аб беларусах замежжа».

Прывітанне Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты было агучана яго намеснікам Іванам Бамбізам, які адзначыў, што, аб'яднаўшыся ў Саюзную дзяржаву, Беларусь і Расія дасягнулі значных вынікаў у шматпланавым супрацоўніцтве.

### АД САМАДЗЕЙНАСЦІ ДА СУР'ЁЗНЫХ СПРАЎ

Старшыня Праўлення «Беларускага таварыства па сувязі з суайчыннікамі «Радзіма» (г. Мінск) Максім Дубянок, гаворачы, што арганізацыя мае паўвекавы вопыт супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай, адзначыў: «Дзякуючы вашым намаганням, дарагія землякі, Рэспубліка Беларусь успрымаецца ў Расіі і свеце як краіна, багатая на гісторыка-культурную спадчыну, гасцінных, таленавітых і працавітых людзей».

«Наша дыяспара не толькі захавала, але і памножыла самаідэнтычнасць. Цяпер у Расіі функцыянуюць пяць музеяў беларускай накіраванасці, дзейнічаюць ужо больш за 20 нефармальных аб'яднанняў. Ад разавых выступленняў калектываў мастацкай самадзейнасці перайшлі да маштабных беларускіх этнакультурных мерапрыемстваў», — паведаміў Валерый Казакоў, распавядаючы пра вынікі дзейнасці аўтаноміі за апошнія пяць гадоў.



**Выступае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

Таксама Валерый Казакоў высока ацаніў працу іркуцкіх беларусаў на чале з нястомным кіраўніком Алегам Рудаковым, якія стварылі ў гэтым горадзе цэлую беларускую этнакультурную сістэму. Дзякуючы кіраўніку рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Маскоўскай вобласці Аляксандру Скрыпелю, на базе Маскоўскага абласнога гуманітарнага каледжа створаны інтэрнацыянальны патрыятычны клуб дружбы народаў Беларусі і Расіі з класам беларускай мовы. Аднак на гэтым спадар Скрыпель не спыніўся і арганізаваў суполку свайго клуба на абаронным заводзе «Метаіст-Серпухаў».

«Не здзіўлюся, дарагія сябры, што неўзабаве рабочыя гэтага завода ў папрок многім, хто сядзіць у гэтай зале, пяройдуць на беларускую мову ў паўсядзённых стасунках», — ці то сур'ёзна, ці то жартам адзначыў Валерый Казакоў.

Распрацавана і дзейнічае праграма «Беларускія вёскі Расіі», якую вядзе Тамара Яшына, фактычна за свой кошт арганізоўваючы тэматычныя навуковыя канферэнцыі. Унікальны праект разам са сваім калектывам вядзе Ірына Капчынская, якая пры дапамозе мінскіх спецыялістаў збірае старадаўнія беларускія песні і захоўвае іх аўтэнтычнае выкананне, а таксама аднаўляе традыцыйныя строі розных рэгіёнаў Беларусі.

### МІЖНАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЗГОДА

Выбары новага старшыні Савета аўтаноміі на з'ездзе для многіх не сталі інтрыгай. Амаль аднагалосна расійскія беларусы сышліся на асобе кіраўніка нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Масквы» Сяргея Кандыбовіча. Першым яго намеснікам стаў Валерый Казакоў. Таксама дэлегаты абралі 36 членаў новага Савета, з якіх 11 — кіраўнікі рэгіянальных нацыянальна-культурных аўтаномій.

«Я не сыходжу з арганізацыі, але перадаю кіраўніцтва ёй вельмі надзейнаму, разумнаму чалавеку, які хварэе за справу Беларусі, — сказаў Валерый Казакоў журналістам пасля абрання новага старшыні. — Пакідаю яму — сёння ўсе на з'ездзе гэта адзначылі — арганізацыю, якая добра працуе і ў якую ўжо цяпер уваходзіць больш за 30 нашых аўтаномій. Упэўнены, што Сяргей Львовіч зробіць усё неабходнае для таго, каб наш карабель плыў далей».

«Надалей аўтаномія з яшчэ большым імпэтам будзе захоўваць беларускую культуру на расійскай зямлі. Таксама мы засяродзім свае сілы на пытаннях міжнацыянальнай згоды ў Расійскай Федэрацыі, у нас ёсць вялікі вопыт у гэтым плане», — сказаў Сяргей Кандыбовіч.

Дарэчы, новы кіраўнік аўтаноміі не толькі актыўны грамадскі дзеяч, а яшчэ і заслужаны дзеяч навукі Расійскай Федэрацыі, тройчы лаўрэат дзяржаўных прэмій Расійскай Федэрацыі, доктар псіхалагічных навук, прафесар. Сяргей Кандыбовіч знаходзіць час на рэалізацыю мноства праектаў, адзін з якіх цяпер рыхтуецца сумесна з Выдавецкім домам «Звязда».

«Гэты цікавы, на мой погляд, праект звязаны з перавыданнем аднаго ўнікальнага альбома. У Маскве ў вельмі пачэсным узросце — пайшоў 93-ці год — жыве Марыяна Фёдараўна Мадурава-Патапава. Яна ў свой час была асабістым сакратаром у Панцеляймона Панамарэнкі. Яе муж, генерал-палкоўнік Патапаў, быў намеснікам маршала Жукава. А яшчэ ў Марыяны Фёдараўны знакаміты бацька — мастак Фёдар Мадураў. Ён стварыў унікальную галерэю партрэтаў беларускіх, украінскіх і бранскіх партызан, і ў 1953 годзе быў выдадзены альбом накладам 10 тысяч экзэмпляраў з рэпрадукцыямі гэтых партрэтаў. Аднак 9999 экзэмпляраў былі пушчаны пад нож, таму што адна з карцін, якая адкрывала альбом, называлася «Партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна». У друкарні застаўся адзіны кантрольны экзэмпляр, які перадалі Марыяне Фёдараўне. І мы дамовіліся перавыдаць гэты альбом», — падзяліўся планамі Сяргей Львовіч.

Пасля шматгадзіннай працы ў Маскоўскім доме нацыянальнасцей дэлегаты і госці з'езда накіраваліся ў Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, дзе сустрэліся з кіраўніком установы Ігарам Петрышэнкам. «Як носьбіты дзвюх культур, вы робіце вялікі ўнёсак ва ўмацаванне беларуска-расійскіх адносін», — звярнуўся пасол да прысутных.

Ён таксама адзначыў, што ўвага беларускай дзяржавы да дыяспары ўзмацняецца. Так, у сакавіку пры Міністэрстве замежных спраў Беларусі створаны Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа. У яго склад у тым ліку ўвайшлі шэсць кіраўнікоў грамадскіх арганізацый беларусаў, якія дзейнічаюць у Расіі.

Ігар Петрышэнка ўручыў узнагароды найбольш актыўным грамадскім дзеячам і арганізацыям беларусаў Расіі. Пасля гэтага ўдзельнікі з'езда маглі пазнаёміцца з новым дзелавым і культурным комплексам пасольства, афіцыйнае адкрыццё якога плануецца ў чэрвені. Гэта будзе пляцоўка-прэзентацыя інвестыцыйнага і экспартнага патэнцыялу дзвюх краін, платформа для дзелавых сустрэч і перамоў, а таксама цэнтр навукі і культуры. Напярэдадні з'езда для дэлегатаў, якія прыбылі з рэгіёнаў загадзя, адбылася маскоўская прэм'ера тэатральнай пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з Віцебска.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

*г. Масква.*

■ Будзь у курсе!

## У КОЛЬКІ ЦЯГНІК ДА ВЕНЫ?

**Беларуская чыгунка ўкараніла міжнародную інфармацыйна-даведачную сістэму MERITS-PRIFIS, якая дазваляе інфармаваць пасажыраў пра расклад руху цягнікоў у Заходняй Еўропе.**

Усе буйныя пункты продажу праязных дакументаў Беларускай чыгункі могуць даць пасажырам вычарпальную інфармацыю аб тым, як дабрацца чыгуначным транспартам, напрыклад, ад Варшавы да Рыма, якія перасадкі трэба зрабіць, колькі будуць каштаваць білеты і гэтак далей.

Даведачную інфармацыю, якая дазваляе дэталёва планаваць свае паездкі ў Еўропе, можна атрымаць на вакзалах станцый Мінск-Пасажырскі (міжнародныя касы па вуліцы Кірава, 2, каса № 5 на чыгуначным вакзале), Орша-Цэнтральная, Маладзечна, Гродна, Баранавічы-Палескія, Баранавічы-Цэнтральныя, Лунінец, Брэст і іншых месцах.

У ходзе праекта MERITS-PRIFIS створана адзіная міжнародная кліенцкая база, якая дазваляе яе ўдзельнікам развіваць продаж ва ўласных сістэмах рэзервавання па ўсёй Еўропе.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Ну і ну!

## СПАТКАННЕ СКОНЧЫЛАСЯ КРАДЗЯЖОМ

**Малады чалавек, якога падазраюць у крадзяжы скарбонкі з залатымі ўпрыгажэннямі, затрыманы аператыўнікамі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы. На такі ўчынак хлопец пайшоў... пасля рамантычнага спаткання.**

Малады чалавек пазнаёміўся з жанчынай у сацыяльных сетках. Яго вырашылі працягнуць ужо дома ў прадстаўніцы прыгожага полу. Знаходзячыся ў гасцях, хлопец дачакаўся, пакуль гаспадыня засне, пасля чаго вынес з дома скарбонку з 11 залатымі ўпрыгажэннямі коштам каля 76 мільёнаў рублёў. Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі асобу злодзея — непрацуючага 27-гадовага мінчаніна. Той ужо паспеў прадаць некалькі скрадзеных упрыгажэнняў, астатнія былі знойдзены падчас вобыску па месцы жыхарства яго дзяўчыны. У праваахоўнікаў ёсць думка, што крадзеж, здзейснены маладым чалавекам, можа быць не адзіным.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ПА ЛЕГЕНДУ — НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Велакультуру ў горадзе пачалі развіваць сем гадоў таму. Побач з цэнтральнай раённай бальніцай паставілі першую паркоўку, зрабілі дарожкі ўздоўж ракі Віліі. Крыніцай натхнення стаў шведскі горад Лунд: менавіта адтуль кіраўнік «ЗАВіК» Таццяна Цітуленка вярнулася з ідэяй зрабіць Вілейку зручнай для веласіпедыстаў.

Падчас прабегу зазірнулі на «Вільянін хутар» — візітную картку горада. Да хутара, які стаіць на паўвостраве сярод возера, вядзе масток. Кажуць, калі пераходзіш яго, трэба спыніцца пасярэдзіне і загадаць жаданне. Калі ты добры чалавек, абавязкова збудзецца. Адразу за мостам расце Дрэва жыцця — канадскі дуб, занесены ў Чырвоную кнігу, сімвал жыццёвай моцы і бясконцага кахання. Крыху далей — невялічкая драўляная пабудова, дзе для маладых (а ў мясцовых пар прынята сюды заязджаць) ствараецца антураж вясковай хаты з покуццю і праводзіцца старажытны вясельны абрад. Адметна, што хутар пабудавалі на сродкі спонсараў — неабыякавых арганізацый і простых гараджан.

**Каб падарожнічаць па невялічкіх гарадах на двух колах, па сутнасці, і спецыяльныя дарожкі неабавязковыя: там веласіпедыст даўно ўспрымаецца як паўнапраўны ўдзельнік дарожнага руху.**

Вілейшчына багатая на легенды. Самая папулярная, вядома ж, пра каханне. Распавядаюць, што даўным-даўно ў гэтым мястэчку жыла прыгожая дзяўчына Вілляна. А непадалёк ад яе — Сцяпан, моцны і працавіты хлопец. Падабаліся яны адно аднаму, але баяліся прызнацца. Праз колькі часу Сцяпан пачаў губляць надзею: не зверне такая дзяўчына ўвагу на звычайнага хлопца, што шые боты і кажухі. Каб заваяваць сэрца прыгажуні, вырашыў звярнуцца па дапамогу да нячыстай сілы. Выйшаў на скрыжаванне дарог і выклікаў чорта. Той, калі пачуў гісторыю Сцяпана, усміхнуўся: «Будзе табе каханне Вілляны. Але ты павінен выканаць мае ўмовы. Зняць крыжык са свайго цела, бо цяжка мне так з табой размаўляць, і аддаць душу». Пагадзіўся Сцяпан, але, калі стаў зрываць з сябе крыжык, ударыла ў хлопца маланка і ператварыла яго ў камень. Даведалася пра гэта Вілляна, прыбегла да каменя і горка заплакала. Са слёз тых утварылася рака — Вілія (хаця



некаторыя старажылы па-ранейшаму называюць яе Віллёй). Ля вытокаў ракі і сёння стаіць вялізны камень. Кожны год вада падмывае бераг і бліжэй падбіраецца да яго. Месцічы расказваюць працяг легенды: надыдзе час, калі рака сустрэнецца з каменем, і ператворацца яны ў хлопца і дзяўчыну, а іх каханне будзе бясконцым.

Па адной з вуліц праязджалі завод «Зеніт», некалі вядомы ва ўсім Саюзе. У савецкія часы тут працавала каля шасці тысяч чалавек! Цяпер на прадпрыемстве фотаапараты ўжо не выпускаюць — робяць оптыку для медыцынскіх прыбораў. Дый супрацоўнікаў у шэсць разоў меней засталося.

Яшчэ адна ўнікальная мясціна Вілейшчыны — мемарыял «Зніклыя вёскі». Памяць аб 253 населеных пунктах, якіх за апошнія 70 гадоў не стала на карце раёна. Некаторыя з іх зніклі ў савецкія гады, калі малыя вёскі ссялялі, бо лічылі неперспектыўнымі. Сорак чатыры былі спалены падчас Вялікай Айчыннай вайны. З дзясятак буйных вёсак (у некаторых было па трыста жыхароў) затапілі пры будаўніцтве Вілейскага вадасховішча.

Само вадасховішча сёння з'яўляецца самым вялікім штучным вадаёмам Беларусі. Прываблівае сотні турыстаў улетку і тысячы ў сезон зімовай рыбалкі. Гараджане жартуюць, што там ніколі не ўбачыш белы лёд: з-за шматлікіх рыбакоў ён здалёк здаецца чорным.

...Няхай і невялікі, але пазнавальны і экалагічны маршрут распрацаваць можна, бадай, у любым раёне. Правільна разрэкламаваць — і турысты, прынамсі з суседніх гарадоў, пацягнуцца. А калі яшчэ легендай прыгожай прыправіць (іх наш народ, дзякуй Богу, багата назапасіў), глядзіш, і госці з замежжа ў беларускую глыбінку заедуць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

### Каментарый да тэмы

**Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Вілейскага райвыканкама Сяргей ПАЎЛОЎСКІ:**

— Мы зацікаўлены ў тым, каб прыцягваць у раён розных турыстаў, таму працуем па некалькіх напрамках. Апошнім часам з'явіліся новыя аграсядзібы, месцы для кемпінга на турыстычнай базе «Клёвае месца» (знаходзіцца ў вёсцы Кучкі побач з Вілейкай). Гады тры таму быў адрамантаваны гарадскі гатэль «Вілія», які цяпер стаў трохзоркавым. Стараемся развіваць падзейны турызм. Так, улетку чакаюцца фестывалі. 3-4 ліпеня на Дні горада будзем святкаваць 555-годдзе Вілейкі. У гэты ж час у «ніжнім парку», на беразе Віліі, упершыню пройдзе рыцарскі фестываль «Гонару Продкаў», падчас якога наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з культурай і гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага, убачыць сярэднявечны ваенна-палявы лагер і сапраўдныя турніры.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12, 13, 14 по генплану в районе пересечения улиц Проектируемой №1, Проектируемой №2 в границах жилого района «Лебяжий». Дом № 14 без инженерных сетей».

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566.

**Юридический адрес**: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3, Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет КУП «УКС Центрального района г. Минска» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 20 по ул. Камайская;
- жилой дом № 12 по ул. Камайская;
- жилой дом № 15 по ул. Ратомская;
- жилой дом № 16 по ул. Мястровская.

Цель проекта – строительство жилого дома № 14 по генплану в составе объекта «Многоквартирные жилые дома по г/п №№ 11, 12, 13, 14 в районе пересечения улиц Проектируемой №1, Проектируемой №2 в границах жилого района «Лебяжий»» общей площадью 12,3 тыс. кв. м, в том числе общая площадь квартир – 10,4 тыс. кв. м.

**Вид строительства**: новое строительство.

**Начало строительства** – 8 сентября 2014 года

**Окончание строительства** – ноябрь 2015 года.

**Проектные решения:** Жилой дом запроектирован 9-этажным 4-секционным, всего квартир – 162, в том числе однокомнатных – 36 шт., двухкомнатных – 72 шт., трехкомнатных – 54 шт. Секции оборудованы лифтами на 630 кг со скоростью 1,0 м/с и мусоропроводом. В техническом подполье запроектированы помещения для инженерного обслуживания дома – помещение ИТП и электрощитовая. Входы в техподполье выполнены непосредственно снаружи.

При входных группах в каждую секцию предусмотрено место для пандуса.

Конструкция здания – монолитный каркас со стенами с плоскими монолитными перекрытиями.

В квартирах, расположенных на 6-м этаже и выше, предусмотрено устройство вторых эвакуационных выходов на лоджию с глухим простенком от торца лоджии и балкона до оконного проема не менее 1,2 м.

Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками; облицовка конструкций приямков и крылец плитами искусственного камня.

Окна – деревянные по СТБ 939-93 с одинарным остеклением (двухкамерный стеклопакет).

Витражи остекления лоджий – из профилей ПВХ.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.06.2010 № 671-15/10. Участок площадью 0,7073 га передан КУП «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома от 13.03.2014 № 591(1) (до 1 августа 2015 года).

Получено разрешение на организацию стройплощадки Госстройнадзора от 08.09.2014 № 2-209Ж-031/14. Получено разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство работ от 26.09.2014 №2-209Ж-031/14.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 7,8% общей площади жилого дома.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства граждан**, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:**

**1 (одна) однокомнатная квартира;**

**8 (восемь) двухкомнатных квартир;**

**5 (пять) трехкомнатных квартир.**

Стоимость 1 м² нормативной площади жилья с учетом затрат, не входящих в сводный сметный расчет, на момент заключения договора долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: 12 877 498 (Двенадцать миллионов восемьсот семьдесят семь тысяч четыреста девяносто восемь) белорусских рублей.

Стоимость 1 м² сверхнормативной площади для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

Для однокомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 812 309 (шестнадцать миллионов восемьсот двенадцать тысяч триста девять) белорусских рублей;

Для двухкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 250 193 (шестнадцать миллионов двести пятьдесят тысяч сто девяносто три) белорусских рубля;

Для трехкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

15 688 077 (пятнадцать миллионов шестьсот восемьдесят восемь тысяч семьдесят семь) белорусских рублей.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства **для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся** в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**3 (три) квартиры**:

Стоимость 1 м² жилья для однокомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 812 309 (шестнадцать миллионов восемьсот двенадцать тысяч триста девять) белорусских рублей;

Стоимость 1 м² жилья для двухкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 250 193 (шестнадцать миллионов двести пятьдесят тысяч сто девяносто три) белорусских рубля;

Стоимость 1 м² жилья для трехкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

15 688 077 (пятнадцать миллионов шестьсот восемьдесят восемь тысяч семьдесят семь) белорусских рублей.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере **40% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (Десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается до окончания строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Оплата производится в белорусских рублях на специальный счет и расчетный счет застройщика.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;
- справка о состоянии на учете граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, **с подтверждением отсутствия в собственности жилых помещений.**

Документы для заключения договоров будут приниматься с 02.06.2015 г. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (Пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по телефону: 306-07-26.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 203/С-584, расположенное по адресу: Витебская область, г.п. Шумилино, ул. Северная, д. 11, площадь – 3891,5 кв.м, назначение – кирпичное двухэтажное здание, котельная, спиртохранилище, здание ремонтного участка, начальная стоимость лота 5.511.861.000 белорусских рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | Витебская область. Право хозяйственного ведения, правообладатель: совместное общество с ограниченной ответственностью «Вежа», УНП 300297504, юридический адрес: Витебская область, г.п. Шумилино, ул. Северная, д. 11. |
| **Местонахождение имущества** | г.п. Шумилино По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору СООО «Вежа» Калыхану Виктору Васильевичу (т.м. 8029-713-53-73). |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32 16 июня 2015 года в 11.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316 Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 60 00 92 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 15 июня 2015 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ОАО «Амкодор-Белвар»

220005, г. Минск, проспект Независимости, 58

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**Собрание состоится 8 июня 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседания Общества (корпус № 30, 3 этаж).**

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55.

Орган, созывающий собрание: Совет директоров Общества. Основание созыва собрания: собственная инициатива Совета директоров Общества.

Дата формирования реестра владельцев акций Общества для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании: 21 мая 2015 г.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об уменьшении уставного фонда ОАО «Амкодор-Белвар».
2. О внесении изменений в устав ОАО «Амкодор-Белвар», связанных с уменьшением уставного фонда на сумму номинальных стоимостей акций, выкупленных Обществом по требованию его акционеров.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), предоставляемой при подготовке к проведению собрания, осуществляется ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 1 июня 2015 г. в отделе кадров Общества по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58 с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 100363840

*Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар»*

# Брестский филиал РУП «Белтелеком»

дополнительно сообщает, что документы на участие в аукционе, который состоится 30.06.2015 г. по объекту: г. Брест, пр-т Партизанский, 4, площадью 119,9 м. кв. принимаются с «28» мая 2015 года по «29» июня 2015 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр. Машерова, 21, каб. № 416. Телефоны для справок: (8-0162) 20-28-88, 22-10-20.

УНП 201003265

белагропромбанк
традиции будущего

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 г.

Форма 1 годовой финансовой отчетности

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 1 279 558 | 935 333 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 5 996 | 7 799 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 5 499 798 | 4 384 117 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 572 742 | 1 244 371 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 10 514 130 | 5 818 581 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 55 039 528 | 48 960 081 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 1 748 | 26 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 248 685 | 210 119 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 3 743 235 | 3 362 592 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 570 | 1 850 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 1 750 458 | 840 418 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 78 656 448 | 65 765 287 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | 4 528 310 | 3 529 334 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 8 737 104 | 9 484 636 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 47 519 712 | 35 177 590 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 5 253 217 | 5 575 840 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 15 204 | 175 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 11 | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 679 209 | 846 457 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 66 732 767 | 54 614 032 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 6 803 591 | 6 803 591 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 938 824 | 510 552 |
| 31 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 1 540 353 | 1 714 454 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 2 538 773 | 2 091 698 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | | | 11 821 541 | 11 120 295 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 102 140 | 30 960 |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 11 923 681 | 11 151 255 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 78 656 448 | 65 765 287 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2014 ГОД

Форма 2 годовой финансовой отчетности

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 9 412 014 | 9 442 086 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 7 059 340 | 7 029 970 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 2 352 674 | 2 412 116 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 1 131 178 | 1 050 625 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 278 878 | 251 954 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 852 300 | 798 671 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 658 | 722 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 1 261 | 63 100 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 548 128 | 227 206 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (7 702) | (36 669) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 577 122 | 663 800 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 1 368 759 | 965 886 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 2 702 316 | 2 166 479 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 272 497 | 207 312 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 1 564 143 | 1 393 441 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 324 401 | 392 196 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 1 239 742 | 1 001 245 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 1 239 742 | 1 001 245 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 1 167 739 | 997 545 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 72 003 | 3 700 |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | 364 | 302 |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2014 ГОД

Форма 3 годовой финансовой отчетности

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | доля неконтролирующих акционеров | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3011 | 6 603 591 | - | 330 217 | 1 520 533 | 1 429 598 | 9 883 939 | 26 265 | 9 910 204 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 200 000 | - | 180 335 | 571 165 | 284 856 | 1 236 356 | 4 695 | 1 241 051 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | X | X | X | 997 545 | 294 065 | 1 291 610 | 5 092 | 1 296 702 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 180 335 | (180 335) | X | - | X | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 200 000 | - | X | (266 338) | X | (66 338) | X | (66 338) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 200 000 | - | X | X | X | 200 000 | X | 200 000 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (266 338) | X | (266 338) | X | (266 338) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | X | X | X | X | - | X | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 6 269 | (6 269) | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 14 024 | (2 940) | 11 084 | (397) | 10 687 |
| 2.9 | приобретение дочернего юридического лица | 30127 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3013 | 6 803 591 | - | 510 552 | 2 091 698 | 1 714 454 | 11 120 295 | 30 960 | 11 151 255 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3011 | 6 803 591 | - | 510 552 | 2 091 698 | 1 714 454 | 11 120 295 | 30 960 | 11 151 255 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 428 272 | 447 075 | (174 101) | 701 246 | 71 180 | 772 426 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | X | X | X | 1 167 739 | (59 036) | 1 108 703 | 72 005 | 1 180 708 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 428 272 | (428 272) | X | - | X | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | X | (399 294) | X | (399 294) | X | (399 294) |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | X | X | X | - | X | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (399 294) | X | (399 294) | X | (399 294) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | - | X | X | X | - | X | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 61 786 | (61 786) | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 45 116 | (53 279) | (8 163) | (825) | (8 988) |
| 5.9 | приобретение дочернего юридического лица | 30127 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3013 | 6 803 591 | - | 938 824 | 2 538 773 | 1 540 353 | 11 821 541 | 102 140 | 11 923 681 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2014 ГОД

Приложение к консолидированному отчету об изменении собственного капитала

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 1 239 742 | 1 001 245 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | (59 034) | 295 457 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | | 86 494 | 349 584 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | 10 227 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | (145 528) | (64 354) |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 1 180 708 | 1 296 702 |
| 4 | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации | | | 1 108 703 | 1 291 610 |
| 5 | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | 72 005 | 5 092 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2014 ГОД

Форма 4 годовой финансовой отчетности

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 9 561 693 | 9 334 370 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (7 084 874) | (7 043 174) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 1 111 533 | 1 047 068 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (269 414) | (247 774) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 658 | 722 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (6 261) | (5 741) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 215 851 | 172 935 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 5 606 | (35 727) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 916 449 | 938 117 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (2 905 941) | (2 173 820) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (316 701) | (322 120) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 1 228 599 | 1 664 856 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 2 518 047 | (631 567) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 78 201 | (497 868) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (3 826 860) | (654 681) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (3 912 331) | (3 115 200) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (505 459) | (215 489) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов - итого | 702 | | (5 648 402) | (5 114 805) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 970 750 | 2 346 830 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | (1 573 126) | (2 243 550) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 9 262 742 | 4 753 233 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (665 399) | (1 888 505) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 34 461 | (114 014) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 8 029 428 | 2 853 994 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | 3 609 625 | (595 955) |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (415 276) | (304 385) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 5 384 | 2 760 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | (19) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (409 892) | (301 644) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | 200 000 |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (399 519) | (267 053) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | (399 519) | (67 053) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 161 454 | 96 240 |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 2 961 668 | (868 412) |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | X | 1 822 779 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 4 784 447 | X |

**И.о.Председателя Правления** **Н.П.Шевцова**

**Главный бухгалтер** **М.А.Шаповалова**

**Дата подписания «5» мая 2015 г.**

**http://belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/finansovaya-otchetnost-bankovskogo-holdinga/godovaya-konsolidirovannaya-finansovaya-otchetsnost/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## Информация об участниках банковского холдинга и связанных с ними лицах Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк») по состоянию на 01 января 2015 г.

| № п/п | Полное и сокращенное (в скобках) наименование юридического лица, фамилия и инициалы физического лица | Место нахождения, место жительства | Фактическое место нахождения, место жительства | Основной вид деятельности юридического лица, дата рождения физического лица | Основание оказания существенного влияния | Дата наступления основания оказания существенного влияния | Удельный вес голосов в процентах | Доля участия в уставном фонде в процентах | Информация о вхождении юридического лица в состав иной банковской группы, банковского холдинга | Основание невключения информации о деятельности |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 1 | Головная организация и участники банковского холдинга | | | | | | | | | |
| 1.1 | Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк») | 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3 | 220036, г.Минск, пр-т Жукова, 3 | деятельность коммерческих банков | | | | | | |
| 1.2 | Открытое акционерное общество «Агролизинг» (ОАО «Агролизинг») | 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31 | 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31 | финансовый лизинг | 1.1ОЕС | 20.07.2006(1.1ОЕС) | 66,67(1.1ОЕС) | 66,67(1.1ОЕС) | нет | |
| 1.3 | Сельскохозяйственное унитарное предприятие «Озерицкий-Агро» (Унитарное предприятие «Озерицкий-Агро») | 222215, Минская обл., Смолевичский р-н, агрогородок Слобода, ул. Центральная, дом 7, комната 16 | 222215, Минская обл., Смолевичский р-н, агрогородок Слобода, ул. Центральная, дом 7, комната 16 | производство, переработка, сбыт сельскохозяйственной продукции | 1.1Н | 04.11.2005(1.1Н) | | 100(1.1Н) | нет | |
| 1.4 | Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт» (Унитарное предприятие «Агробизнесконсалт») | 220123, г. Минск, ул. Веры Хоружей, 22, пом. №36 (офис 1703) | 220123, г. Минск, ул. Веры Хоружей, 22, пом. №36 (офис 1703) | консультирование по вопросам коммерческой деятельности и управления | 1.1Н | 19.02.2008(1.1Н) | | 100(1.1Н) | нет | «А» |
| 1.5 | Открытое акционерное общество «Туровщина» (ОАО «Туровщина») | 247991, Гомельская область, Житковичский район, деревня Озераны, ул. Молодежная, 1 | 247991, Гомельская область, Житковичский район, деревня Озераны, ул. Молодежная, 1 | сельское хозяйство | 1.1ОЕС | 20.08.2009(1.1ОЕ) 20.11.2009(1.1С) | 95,87(1.1ОЕС) | 95,87(1.1ОЕС) | нет | |
| 2 | Лица, передавшие право на участие в управлении участником банковского холдинга, указанным в графе 2 пункта 1 настоящего приложения | | | | | | | | | |
| 2.1 | | | | | | | | | | |
| 3 | Индивидуальный предприниматель (управляющий) | | | | | | | | | |
| 3.1 | | | | | | | | | | |

**Заместитель Председателя Правления** **С.П.Чугай**

KPMG

**ООО «КПМГ»**
пр-т Дзержинского, 57
помещение 53, офис 53-2
220089, Минск, Беларусь

Телефон +375 17 372 72 57
Факс +375 17 372 72 58
Интернет www.kpmg.by

## Аудиторское заключение независимых аудиторов по сокращенной годовой консолидированной финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» за 2014 год

*Заинтересованным пользователям*

Исх. номер 1205-03

*Заключение по сокращенной годовой консолидированной финансовой отчетности*

Прилагаемая сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность, которая включает в себя консолидированный бухгалтерский баланс по состоянию на 1 января 2015 года, консолидированный отчет о прибылях и убытках, консолидированный отчет об изменении собственного капитала и консолидированный отчет о движении денежных средств за 2014 год, составлена на основании аудированной годовой консолидированной финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» (далее — «Банк») и его дочерних организаций (далее — «Банковский холдинг») за 2014 год, подготовленной в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь. В нашем аудиторском заключении от 12 мая 2015 года мы выразили безусловно положительное аудиторское мнение по годовой консолидированной финансовой отчетности Банковского холдинга.

Сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность не включает всех раскрытий, требуемых законодательством Республики Беларусь. Таким образом, изучение сокращенной годовой консолидированной финансовой отчетности не заменяет изучения аудированной годовой консолидированной финансовой отчетности Банковского холдинга.

*Ответственность руководства за подготовку годовой консолидированной финансовой отчетности*

Руководство Банковского холдинга несет ответственность за подготовку и объективное представление сокращенной годовой консолидированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции о порядке раскрытия информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.01.2013 № 19.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о данной сокращенной годовой консолидированной финансовой отчетности на основании проведенных нами аудиторских процедур в соответствии с требованиями Национального правила аудиторской деятельности «Аудиторское заключение по специальному аудиторскому заданию», глава 6, утвержденного Постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 23.01.2002 № 8.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, сокращенная годовая консолидированная финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной годовой консолидированной финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» и его дочерних организаций за 2014 год, соответствует во всех существенных отношениях годовой консолидированной финансовой отчетности, на основе которой она была подготовлена в соответствии с требованиями Инструкции о порядке раскрытия информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.01.2013 № 19.

**Верещагина Ирина Владимировна**
Директор ООО «КПМГ»

**Борисенко Татьяна Михайловна**
Руководитель аудиторской группы

12 мая 2015 года

*Сведения об аудируемом лице*
Наименование: Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»
Сведения о регистрации: зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный номер в ЕГР юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100693551
Юридический адрес: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Жукова, 3

*Сведения об аудиторской организации*
Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «КПМГ»
Сведения о регистрации: зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 10.02.2011, регистрационный номер в ЕГР юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 191434140
Юридический адрес: 220089, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, 57, офис 53-2



# Лячыцца колерам

## прапануе маладая мастачка і выкладчыца Вольга Грыбава

**— ...Я сёння ў жоўтай куртцы, таму, напэўна, думаеце, што я камунікабельная і добрая, настроеная на размову. Калі б я была ў сінім — думалі б, што я сур'ёзная, закрытая. А вам падыходзіць нябесна-блакітны, бо знешнасць кантрасная, — так пачалася мая сустрэча з мастачкай і выкладчыцай Вольгай Грыбавай.**

**Вольга — чалавек, які можа зразумець, хто перад ім, з першага погляду, расказаць, што яму падыходзіць і не падыходзіць, бо яна, акрамя таго, што займаецца мастацтвам, з'яўляецца спецыялісткай у не дужа вядомай пакуль у нашай краіне каларыстыцы.**

### НАВУКА КАЛАРЫСТЫКА

— З колерам я пазнаёмілася ў мастацкай школе, пасля працягвала ва ўніверсітэце, у магістратуры, міжнароднай школе Багамолава. Мой галоўны настаўнік — Святлана Валканава, якая дапамагала мне спасцігаць колеразнаўства, — гаворыць Вольга. — Міжнародная школа, стылістыка, якая сёння ёсць, — гэта каларыты знешнасці, гэта модна. І калі я пачала з гэтым разбірацца, пачаліся лёгкія дысанансы, бо там на акадэмічных ведах нічога не заснавана. Мне прыйшлося знаходзіць новыя канцэпцыі выкладання, бо мода — гэта адна гісторыя, а мастацтва — гэта іншая гісторыя, і людзей, якія перакрыжоўваюцца тут, зусім мала.

Сёння Вольга Грыбава цалкам захоплена працай у сферы каларыстыкі. Каларыстыка — гэта навука, якая ўключае ў сябе розныя бакі колеру: колеразнаўства, якое вывучаюць дызайнеры і мастакі, фізіялогію, псіхалогію і многае іншае. Па-першае, каларыстыка — гэта маркетынг (дарэчы, 60% інфармацыі пра колер мы атрымліваем падсвядома), таму гэтай навукай і карыстаюцца маркетолагі: колер брэнда вельмі важны, на гэтым можна зарабляць грошы. Напрыклад, Coca-Cola шмат грошай аддала за колеры свайго брэнда. Кожная мэтавая аўдыторыя любіць розныя колеравыя гамы: насычаныя, яркія колеры любяць людзі, якія займаюцца спортам, фізічнай працай, падлеткі і дзеці; людзі, якія працуюць у сферы, напрыклад, культуры, не выберуць такія насычаныя адценні. У залежнасці ад гэтага выбіраюць свае колеры і брэнды. Вы, напэўна, заўважалі, што зялёны колер — гэта ўхваленне, а чырвоны — пратэст. Гэтыя колеры выкарыстоўваюцца ў мабільных тэлефонах. Калі трэба прыцягнуць увагу, выкарыстоўваюць жоўты.

Другі аспект каларыстыкі — гэта знешнасць. Можна даведацца, як выкарыстоўваць колер у вобразе. Безумоўна, цяпер гэты напрамак вельмі папулярны (мужчыны цікавяцца гэтым ледзь не больш за жанчын). Калі вы хочаце паказаць жаноцкасць, то будзеце выкарыстоўваць мяккія колеры, калі пры гэтым хочаце чагосьці дабіцца — трэба рабіць акцэнты на аксесуарах.

Па-трэцяе, каларыстыка дазваляе працаваць з дызайнерамі, але далёка не ўсе з іх ведаюць псіхалогію і фізіялогію колеру. Напрыклад, часам дызайнеры пачынаюць падбіраць колеры ў інтэр'еры, робяць прыгожыя пакоі, але там няўтульна, таму ім таксама патрэбны веды па каларыстыцы.

— У нас існуе праблема з разуменнем значэння колераў. Пасля жыцця ў Савецкім Саюзе жанчыны гэтага не ведалі: гардэроб з шэрым, чорным і белым. Колер — гэта эмоцыя, яе трэба праяўляць, а мы не ўмеем, — тлумачыць Вольга Грыбава. — У нас вельмі мала майстроў, якія выкладаюць каларыстыку. Пра колер увогуле шмат літаратуры, але яна на замежных мовах. Як толькі пачынаецца занятак са студэнтамі, я пытаюся: «Якія ў вас праблемы ў працы з колерам?» Вучні адказваюць, што праблем няма. Пасля паўгадзіны лекцыі пытанні з'яўляюцца. Тут шмат падводных камянёў, таму нельга грунтавацца толькі на адной літаратурнай крыніцы, напрыклад.

Увогуле каларыстыка ўзнікла ў пачатку XX стагоддзя (у гэты час колер стаў больш даступным, вывучаўся маркетолагамі. Але каларыстыка існавала крыху ў іншым выглядзе і ў часы Гётэ, Ньютана, Леанарда). Адразу былі даследаванні, а пасля з'явілася кніга «Пачуццё брэнда», дзе вывучаецца ўплыў колеру на маркетынг. Навука вельмі папулярная ў ЗША і ў Еўропе, напрыклад, у Грэцыі. Пра каларыстыку няма літаратуры «лёгкай», якую можна пачытаць на адпачынку. Хутчэй гэта крыніцы, дзе трэба разбірацца ў мастацтве ці хаця б яго любіць.





— Колератэрапія і каларыстыка звязаныя. Зараз псіхолагі пачынаюць працаваць з гэтым напрамкам, але каб добра працаваць, то трэба ведаць і псіхалогію, і колер. Колерам сапраўды можна лячыць, асабліва гэта папулярна ў Індыі, там ёсць вельмі даўнія школы. Гэтаму трэба вучыцца, а ў нас пакуль такіх майстроў няма.

### ТЭРАПІЯ І СРОДАК МАСТАЦТВА

Колератэрапія становіцца папулярным напрамкам. Калі можна лячыцца, напрыклад, салянымі пячорамі, то чаму нельга лячыцца колерам? Іншая справа, што гэта трэба разумець і практыкаваць. Вольга вучылася на мастацка-графічным факультэце ў Віцебску, але гэтага ёй аказалася мала. Яна займалася адукацыяй пасля ўніверсітэта, займаецца і цяпер. Лічыць, што калі атрымала веды, то іх нельга ўтойваць ад іншых, гэта адказнасць.

— Мне падабаецца быць выкладчыцай. Я з роду выкладчыкаў. Але я пайшла вучыцца ў педагагічны, ведаючы, што не буду настаўніцай, а буду мастаком. Пасля так атрымалася, што я стала выкладаць. Я расказваю пра тэмы, якія мне падабаюцца. Гэта як расказаць людзям пра любімага чалавека — працай за ўсё. Я кажу пра тое, што я ведаю, нават уяўляю сябе выкладчыцай у 60. Я проста закахалася ў некаторых сваіх настаўнікаў, захацела быць такімі, як яны, а калі пачала працаваць сама, зразумела, што можна быць цікавай, калі прыкласці крыху намаганняў. Можна станавіцца на парту, можна бегаць босымі нагамі па аўдыторыі.

Яна гаворыць пра сваю эмацыйнасць, пра тое, што калі нешта перажываеш, то трэба абавязкова праяўляць гэта ў нейкай форме. Гэты неверагодна актыўны чалавек заўсёды малюе.

— У мяне эмоцыі выходзяць праз мае працы, і чым больш вострая эмоцыя, тым хутчэй робіцца праца і больш яркай атрымліваецца. Мае працы экспрэсіўныя, акварэльныя. Я малюю пачуцці. Маё жыццё можна зразумець па карцінах — як яно змянялася, што адбывалася. Каб я не магла пісаць, я пачала б танцаваць, спяваць, бо эмоцыі павінны мець аб'ектыўную форму, у іх ёсць энергетычная аснова. Мне нельга не маляваць. Мастацтва дапамагае не падманваць сябе, — прызнаецца Вольга. — Напачатку ёсць ідэя — добра, калі ёсць эскіз, але бывае, што праца пачынаецца з эмоцыі. Ёсць мае рукі, яны ўсё робяць самі. Я не веру, што людзі гэта прыдумалі, нам гэта даецца неяк звыш. Малюнак — гэта як страва. Ён павінен «зварыцца», на гэта патрэбен час.

Аднойчы Вольга малявала на «Карнавале руж» у Батанічным садзе. Тады яна была ў навушніках, пісала пад музыку.

— У час працы не існуе нічога больш. Са мной дарэмна нават размаўляць. Гэта цудоўны стан. Працу нельга недарабіць. Хай яна пастаіць колькі заўгодна, але прыйдзе час, і яна дамалюецца. Мне цяжка расстацца з карцінамі. Я аддаю іх, калі толькі гатовая аддаць.

Сёння мастачка працуе з новымі жанрамі — ёй падабаецца маляваць фэшн-эскізы. Пакуль у нас гэта не надта развіта і не вельмі проста. Але Вольга спрабуе, друкуецца на тэмы мастацтва ў модзе. Цяпер рыхтуе да выхаду ўласную кнігу. Гэта матэрыялы па каларыстыцы для візажыстаў, для індустрыі прыгажосці. Да кнігі ўжо падбіраюцца фотаздымкі, і неўзабаве яе ўжо можна будзе ўбачыць. Акрамя таго, дзяўчына рабіла выставу сваіх прац у ГЦ «Еўропа», у арт-кавярні «Чаплін». Амаль тады ж яна з калегамі стварылі праект «Join» — каманду, дзе яны нешта прыдумляюць і прыцягваюць да працы іншых людзей:

— Гэта і студэнты, і проста людзі, якім цікава. Мы распрацоўвалі адзенне, падбіралі колеры. Мы робім так, каб мастацтва пераходзіла ў жыццё, у бізнес, у моду. Мы паказваем тое мастацтва, якое можна выкарыстоўваць і якое можа быць карысным.

Вольга казала, што калі яна займалася ў акцёрскім гуртку, то выконвала заданне — пісала на паперы, чаго баіцца. І напісала, што баіцца перастаць марыць. Бо чалавек ведае, што рабіць, пакуль ён марыць, а калі не марыць, то што рабіць?

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15



# ПРЫГАЖУН БЭЗ

**З надыходам вясны бэз цешыць вока вялікімі суквеццямі, распаўсюджваючы вакол моцны, прыемны пах. Ды і сам куст вельмі сакавітага зялёнага колеру і захоўвае сваю лістоту да самых халадоў. Тэрміны цвіцення гэтай расліны залежаць ад віду.**

### ПАСАДКА

Пажадана выбраць для бэзу сонечнае месца, роўнае або з невялікім схілам. Зрэшты, паўцень расліна гэтак жа добра пераносіць, але цвіце непараўнальна багацей усё ж на сонцы. Забалочаныя і сырыя глебы для бэзу супрацьпаказаныя, таксама не рэкамендавана яму гліністая глеба.

Саджаць бэз лепш за ўсё ў верасні. Да халадоў яшчэ ёсць час, каб расліна ўкаранілася. Паказчыкам своечасовасці пасадкі можа служыць лістота. Калі лісце абсыпалася — вы спазніліся з пасадкай. У выпадку, калі вы ўжо выкапалі бэз, але наступілі маразы, то трэба прыкапаць яго ў нахільным стане, як пладовыя саджанцы, і пакінуць да вясны. Падрыхтуйце ямы для вясновай пасадкі адразу з восені, бо чым раней вясной вы пасадзіце бэз, тым хутчэй ён прыжывецца. Абавязковай умовай з'яўляецца тое, што трэба зрабіць пасадку да набракання пупышак, інакш існуе вялікая рызыка гібелі расліны.

### ДОГЛЯД

Бэз — вельмі непатрабавальная расліна. Агульныя рэкамендацыі па доглядзе — як для большасці кустоў, якія цвітуць.

Пасля пасадкі шчодра паліце і замульчыруйце глебу. Добра расце і цвіце бэз пры дастатковым увільгатненні.

У маі-чэрвені трэба паліваць больш інтэнсіўна, таму што расліна пачынае цвісці і патрабуе больш вільгаці. Але нельга пераліваць. З сярэдзіны ліпеня бэз ужо не паліваюць, каб не справакаваць абуджэння пупышак.

Калі пры пасадцы ў пасадачную яму вы ўнеслі дастатковую колькасць угнаенняў, то каля 3 гадоў угнойваць глебу не трэба. Далейшыя падкормкі бэзу будуць заключацца ва ўнясенні арганікі (гной, птушыны памёт, кампосная жыжа) і мінеральных угнаенняў (фосфар і калій у жніўні раз на 2-3 гады, аміячную салетру — калі выпадзе снег).

Калі расліна набіраецца сіл і актыўна расце, можна папырскаць па лістоце мінеральнымі ўгнаеннямі.

Адцвілыя гронкі трэба абразаць адразу пасля цвіцення: гэта абумоўлена тым, што кветкавыя пупышкі ўтвараюцца на летніх парастках. Калі абрэзаць адцвілыя суквецці восенню, то наступнай вясной бэз не зацвіце.

Калі бэз патрабуе санітарнай абрэзкі, то не мае значэння, у які час года яе праводзіць, але лепш вясной.

Каб абнавіць у дарослага бэзу старыя галіны на новыя, рабіце гэта паступова, выразаючы па 1-2 старыя галіны за год вясной.

Часам робяць бэзу культурную абрэзку. Для гэтага пакідаюць асноўныя 6 і больш галін на некаторай адлегласці адна ад адной, каб надаць кусту разгалісты выгляд, а ўсе астатнія выразаюць; тыя ж, што накіраваны ўсярэдзіну куста, выразаюць зусім. Гэта надае форму і прыгожы выгляд пры цвіценні. Пажадана праводзіць такую абрэзку кожны год вясной, да набракання пупышак.

### РАЗМНАЖЭННЕ

Садовы бэз размнажаецца чаранкамі, адводкамі, прышчэпкай.

Пры размнажэнні адводкам да восені вы ўжо будзеце мець добры аднагадовы саджанец, гатовы да перасадкі. Для гэтага трэба зрабіць каля куста бэзу гарызантальныя разоры, прыхіліць галінкі да зямлі і замацаваць. І з пупышак парасткаў разаўюцца адводкі. Мацярынская расліна пры гэтым захавае ўсе свае дэкаратыўныя ўласцівасці. Але не ўсе віды бэзу так размнажаюцца.

Калі ж хочаце размножыць чаранкаваннем, то вазьміце паўадраўнелыя, добра развітыя парасткі летам (чэрвень — пачатак ліпеня), на чаранкі бярэцца сярэдняя частка парасткаў.

Можна з насення вырасціць прышчэпы і на іх зрабіць прышчэпку. Для прышчэпкі можна ўзяць прышчэпу бэзу звычайнага, біручыны або венгерскага бэзу.

Збор насення прыпадае на кастрычнік. Высейваць можна ўвосень, пасля таго як высыплеце яго са скрыначак і прасушыце. Дзеля гэтага загадзя падрыхтуйце для насення градку. Высейваюць з першым сняжком у падмерзлую градку, закапаўшы на 1,5 см. Увесну можаце пікіраваць і дарошчваць гатовыя саджанцы.

Можна высаджваць насенне і вясной, але для гэтага спатрэбіцца стратыфікацыя. Дзесьці ў сярэдзіне сакавіка насенне высейваюць у скрыні. У розных відаў бэзу ўсходжасць насення розная, адно насенне ўзыдзе на 12-15-ы дзень, а іншае — праз 2-3 месяцы. Пасля фарміравання 4 лістоў расаду пікіруюць на адлегласць 4 см. У маі сеянцы высаджваюць на пастаяннае месца ў сад.

# Памятка агародніка

### ТАМАТЫ

***Перад пасадкай***

За 5-6 дзён зямлю трэба праліць гарачай вадой і растворам меднага купарвасу (1 ст. лыжка на вядро вады), накрыць плёнкай.

❍ Пасадзіце ў цяпліцу і на градку настурку — ад белакрылкі, базілік — ад хвароб і проста любіць суседства, намажце вазелінам жоўтую паперку і пакладзіце ў парнік.

❍ Трымайце цяпліцу адкрытай.

❍ Мульчыруйце, калі прагрэецца зямля, травой, сенам.

❍ Палівайце пад мульчу.

❍ Зрабіце пару разоў прапарванне: закрыйце цяпліцу на паўдня, потым добра праветрыце.



***Апырскванне ад хвароб***

1 літр абястлушчанага малака, 20 кропель ёду на вядро вады. Як прафілактыка — 1 раз на два тыдні, можна дабавіць зялёнага мыла. Можна паліваць і слабым растворам марганцоўкі.

❍ Праткніце сцвалы медным дротам або зубачысткай.

❍ Насячыце бацвінне, запраўце ў зямлю.

***Прафілактыка фітафтарозу***

1. Праз пяць дзён пасля высадкі расады развядзіце 1 г меднага купарвасу ў 4 літрах дажджавой мяккай вады і апырскайце разліны.

2. Праз пяць дзён пасля першай апрацоўкі з палівачкі: 40 г сухога хвашчу заліць вадой, кіпяціць 15 хвілін, адвар зліць і захаваць. Асадак заліць і кіпяціць 10 хвілін. Адвары злучыць, давесці да 5 літраў.

3. Праз пяць дзён пасля папярэдняй апрацоўкі: 0,5 літра абястлушчанага малака, 50 кропель ёду на 5 літраў вады.

4. Праз 7-10 дзён пасля папярэдняй апрацоўкі: 1 мл эпіну на 5 літраў вады.

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ШЛЮБ ЦАРКОЎНЫ. Да абраду, які выконваўся святаром у храме, каб паяднаць маладых, гэта значыць шлюбу, у народным асяродку былі сфарміраваны свае правілы і рэгламентацыі, а за шмат гадоў яго існавання з'явіліся прыкметы, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

◈ Пакуль маладыя ехалі ў храм, у хаце адчынялі ўсе куфары, вокны, дзверы, развязвалі ўсе вузлы і прасілі нябёсы благаславіць шлюб і «лёгкае» нараджэнне дзяцей.

◈ Перш чым зайсці ў храм, маладыя павінны былі пачаставаць усіх сустрэтых на шляху людзей, дзяцей, убогіх, жабракоў печывам, пірагамі і іншымі прысмакамі. Лічылася, чым больш пачастункаў будзе раздадзена, тым «багацей» будзе жыццё маладых.

◈ Каб быць неразлучнымі, маладыя павінны былі пераступіць царкоўны парог разам.

◈ Падчас абраду ім трэба было стаяць на ручніку. Пад ручнік маглі пакласці некалькі залатых або медных манет, чырвоны пояс-абярэг і іншыя сімвалічныя рэчы. Усе яны павінны былі «стварыць» спрыяльныя ўмовы для жыцця маладых.

◈ Ручнік, на якім маладыя стаялі падчас вянчання, трэба было адразу згарнуць сватам або хроснаму бацьку, каб ніхто не тое што наступіў на яго, але нават і не дакрануўся (каб па жыцці ніхто жонку «не лапаў»).

◈ Прысутнасць бацькоў жаніха і нявесты падчас вянчання не дапускалася.

◈ Пасля вянчання ў храме нічога не пакідалі. Аднак неабходна памятаць: «За дабро дабром адгукаюцца». Таму і храму трэба было абавязкова зрабіць рытуальны падарунак за выкананне таінства вянчання. Традыцыйна такім падарункам быў ільняны ручнік (але зусім не той, на якім стаялі маладыя!), у які загортвалі бохан свежага хлеба, пірагі, якое-небудзь іншае печыва, цукеркі і г.д.

◈ На парозе з храма маладых абсыпалі зернем, манетамі, каб жыццё было шчаслівым. Верылі, што першы сустрэты каля царквы чалавек прадказвае будучыню маладых: добра апрануты — да багацця, жабрак — да недастачы.

◈ Тое адзенне, у якім бралі шлюб маладыя, нельга было аддаваць камусьці іншаму, выкарыстоўваць у паўсядзённым жыцці.

◈ Вянчальныя свечкі захоўвалі ўсё жыццё за абразамі ў чырвоным куце. Лічылася, пакуль яны там, шчасце не пакіне хату. Неабходна ведаць, што запальваць іх можна было або пры цяжкіх родах, або ў выпадку хваробы дзяцей.

■ Ну і ну!

## НАКІРАВАЎ НА ДАІШНІКАЎ... ПІСТАЛЕТ

**Дзякуючы прафесійным дзеянням маладых інспектараў ДПС аддзела ДАІ Кастрычніцкага РУУС сталіцы быў затрыманы 26-гадовы мінчанін, які кіраваў транспартным сродкам нападпітку. Падчас праверкі дакументаў той дастаў з кішэні пісталет.**

Знаходзячыся на маршруце патрулявання, экіпаж звярнуў увагу на чорны «Фольксваген», які рухаўся па праезнай частцы неяк зусім марудна. Праехаўшы міма супрацоўнікаў міліцыі, кіроўца нечакана рэзка звярнуў у найбліжэйшы двор па вуліцы Асаналіева. Калі інспектары падышлі да дзвярэй кіроўцы, адразу зразумелі, што малады чалавек за рулём знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення. Аднак той, выйшаўшы з салона, адмаўляў факт кіравання аўтамабілем, які належаў яго маці. Супрацоўнікі міліцыі папрасілі прад'явіць дакументы. Кіроўца палез ва ўнутраную кішэню і выцягнуў адтуль прадмет, падобны на пісталет Макарава, які накіраваў у бок аднаго з інспектараў. На абясшкоджанне пагрозы таму спатрэбіліся лічаныя секунды, а пісталет аказаўся пнеўматычным. Паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, колькасць пароў алкаголю ў паветры, якое выдыхаў кіроўца, складала каля 2 праміле. Высветлілася, што раней малады чалавек ужо прыцягваўся да адказнасці за непадпарадкаванне службовай асобе.

## НА ЧУЖОЕ ПАКВАПІЛІСЯ АХОЎНІКІ

**Аператыўнікі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС г. Мінска ўстанавілі і затрымалі двух хлопцаў і дзяўчыну, якія падазраюцца ў крадзяжы рэчаў на суму каля сямі мільёнаў рублёў з ячэйкі камеры захоўвання аднаго з гандлёвых цэнтраў. Высветлілася, што затрыманыя хлопцы самі працуюць... ахоўнікамі ў іншым сталічным гандлёвым цэнтры.**

Гісторыя пачалася са звароту ў міліцыю дзяўчыны, якая прасіла дапамагчы адшукаць яе рэчы (скураную куртку, касметыку і сонцаахоўныя акуляры), што былі скрадзены з камеры захоўвання гандлёвага цэнтра на праспекце Пераможцаў. Пры аналізе запісаў з камер відэаназірання ў поле зроку аператыўнікаў трапілі маладыя людзі, якія адкрылі чужую ячэйку і дасталі адтуль рэчы. Потым высветлілася, што яны скарысталіся ключом ад сваёй ячэйкі. Неўзабаве былі ўстаноўлены асобы падазраваных. Два 21-гадовыя хлопцы працуюць ахоўнікамі ў адным са сталічных гандлёвых цэнтраў, іх равесніца вучыцца ў інстытуце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.50 | 21.24 | 16.34 |
| Віцебск | 4.33 | 21.21 | 16.48 |
| Магілёў | 4.40 | 21.14 | 16.34 |
| Гомель | 4.45 | 21.02 | 16.17 |
| Гродна | 5.07 | 21.38 | 16.31 |
| Брэст | 5.16 | 21.30 | 16.14 |

### Месяц

*Першая квадра 25 мая.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

***Пр.*** *Максіма, Мікіты, Нікіфара.*
***К.*** *Аўгусціна, Юльяна, Яна.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +15..+17°C | КІЕЎ +18..+20°C | РЫГА +16..+18°C |
| ВІЛЬНЮС +16..+18°C | МАСКВА +22..+24°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +14..+16°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**Ідзяце ў казіно — апранайце самыя прыгожыя і чыстыя трусы.**

**Магчыма, менавіта ў іх адных вы і будзеце вяртацца.**

Адэская размова.

— Маман, дайце мне грошай на кветкі — я іду на спатканне з дзяўчынай!

— Сёма, ты сышоў з розуму не на тым прыпынку! Што такое букецік руж? Гэта праз 3 дні калючы венік! Лепш падары дзяўчыне маю герань — ад яе будзе дохнуць моль!

**Цудоўныя пятніца, субота і нядзеля — жаночага роду, падлюга панядзелак — мужчынскага. Дзіўнаватая заканамернасць...**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.117. Індэкс 63850. Зак. № 2038.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 мая 2015 года.